Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 САКАВІКА 2017 г. АЎТОРАК № 53 (28417)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Лаўкост да нас даляціць?

СТАР. 4



«Спадкаемцы» Полацкага Евангелля

СТАР. 9



Асцярожна: махляры

СТАР. 14

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ВАШЧАНКА, міністр па надзвычайных сітуацыях:**

*«Кіраўніком дзяржавы пастаўлена задача зняць усе лішнія праверкі, стымуляваць дзелавую актыўнасць. Тут нам неабходна, вядома ж, шукаць падыходы ў наглядной дзейнасці. Мы даўно працуем з бізнесам, і сур'ёзных праблем не ўзнікала. Пасля прыняцця рашэння аб спыненні праверак выказваліся меркаванні, што асабліва наглядная дзейнасць МНС і не перашкаджала: ёсць закон, ёсць патрабаванні, і ёсць кіраўнікі, службовыя асобы, якія павінны выконваць гэтыя законы і патрабаванні. Мы, у сваю чаргу, заўсёды гатовыя да дыялогу, гатовыя прыйсці, дапамагчы, падказаць, навучыць, паўдзельнічаць. Галоўнае — забяспечыць высокі ўзровень бяспекі і прыняць усе меры па захаванні жыцця і здароўя людзей».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8829 | ▼ |
| Еўра | 2,0253 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0700 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# РУХ БЕЗ ПЕРАШКОД



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Прыгожыя і моцныя

## ЖАНЧЫНЫ МОГУЦЬ УСЁ

### Працаваць, выхоўваць, ствараць і перамагаць

**Маці, берагіні, выхавальніцы дзяцей, захавальніцы сямейнага ачага, нястомныя працаўніцы і проста прыгажуні. Такія яны — сучасныя жанчыны Беларусі, найлепшыя прадстаўніцы якіх сёлета атрымалі высокую ўзнагароду ад Беларускага саюза жанчын — прызнанне сваіх заслуг і дасягненняў у чарговым конкурсе «Жанчына года — 2016».**

СТАР. 5



Фота БЕЛТА.

**Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, старшыня ГА «Беларускі саюз жанчын» Марыяна ШЧОТКІНА ўручае ўзнагароду намесніку старшыні Магілёўскага гарвыканкама Але ГАЛУШЦЫ.**

■ Інавацыі з прабіркі

## СВАЁ — ЗАЎСЁДЫ НАЙЛЕПШАЕ

### Якімі дасягненнямі могуць пахваліцца вучоныя-расліноводы?



**«Сучаснае раслінаводства немагчыма ўявіць без укаранення і суправаджэння сучаснымі тэхналогіямі, — мяркуе намеснік генеральнага дырэктара па навуцы Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па земляробстве Дзмітрый ЛУЖЫНСКІ. — На айчынных палях урабляецца больш за 40 культур, распрацаваных у нашай краіне, яны займаюць каля трох чвэрцяў ад усіх пасяўных плошчаў. Штогод мы рэкамендуем для вырошчвання ад 8 да 15 новых сартоў».**

Паводле слоў спецыяліста, распрацаваныя ў Беларусі сарты раслінаводчых культур не заўсёды пераўзыходзяць свае замежныя аналагі, аднак яны найлепш адаптаваны да нашага клімату. Так, напрыклад, толькі за апошні год аграрыі прапанавалі шэраг сартоў: пшаніцу яравую «Манета» з ураджайнасцю да 110 цэнтнераў з гектара, азімую пшаніцу «Гірлянда», устойлівую да неспрыяльнай зімоўкі з частымі адлігамі і пахаладаннямі, і іншыя. Адна з актуальных праблем, якія вырашаюцца цяпер, — забеспячэнне сельскай гаспадаркі бялкамі. Іх адсутнасць прыводзіць да перарасходу кармоў мінімум на 30 працэнтаў. Пры дапамозе селекцыі былі распрацаваны сарты такіх культур, як віка яравая, лубін вузкалісты і гарох. Іх вырошчванне дазволіць адмовіцца ад імпарту соі і сэканоміць каля 100 мільёнаў долараў у год.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# БЯСПЕКА ПЕРШ ЗА ЎСЁ

## Прэзідэнт зацвердзіў задуму беларуска-расійскіх вучэнняў

**Ужо ў верасні гэтага года маюць адбыцца сумесныя беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2017». Яны традыцыйна праводзяцца раз на два гады па чарзе на тэрыторыі абедзвюх краін. Гэтым разам наша чарга прымаць вучэнні. З гэтай нагоды ўчора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад аб задуме вучэнняў Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017».**

Зараз на заходнім напрамку ў Беларусі і Расіі створана моцная групоўка Узброеных Сіл, аснову якіх складаюць Узброеныя Сілы нашай краіны. «У выпадку канфлікту і, не дай бог, вайны існуе вызначаны план вядзення баявых дзеянняў сіламі беларускіх Узброеных Сіл, якія неадкладна падмацоўваюцца адпаведнымі Узброенымі Сіламі Расійскай Федэрацыі. Таму мы ні ад каго ніколі не ўтойвалі і не ўтойваем, што ў мірны час порах трэба трымаць сухім», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Такім чынам маючае адбыцца вучэнне з'яўляецца лепшым спосабам праверыць гатоўнасць ваеннаслужачых двух краін да ўзаемадзеяння.

Апошнія падзеі насцярожваюць і вымушаюць казаць пра тое, што самазаспакойвацца ні ў якім разе нельга. І гэта не значыць, што ў Беларусі шмат праблем у частцы супрацьстаяння беларуска-расійскай групоўкі і падраздзяленняў блока НАТА, які сёння ажывіўся, умацоўваецца, узмацняецца, размяшчае дадатковыя кантынгенты войскаў каля межаў краіны. «Нас гэта, шчыра кажучы, хвалюе менш. Нас больш хвалююць спробы сучаснымі метадамі праціборства, супрацьстаяння нагнятаць абстаноўку ўнутры Беларусі і весці супраць яе адпаведныя дзеянні», — сказаў Прэзідэнт. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, маецца на ўвазе спроба «пятай калоны» пры падтрымцы і фінансаванні заходніх фондаў, кіраўніцтве заходніх спецслужбамі, нагнятаць сітуацыю ў Беларусі.

Нягледзячы на існуючыя на гэты момант супярэчнасці ў беларуска-расійскіх адносінах, гэта ніяк не датычыцца пытанняў бяспекі. Акурат наадварот, вучэнне — гэта дэманстрацыя пастаянства ў забеспячэнні бяспекі двух братэрскіх народаў. «Як бы не складваліся нашы адносіны ў вобласці нафты, газу, харчавання і іншага — гэта пытанні вырашаемыя. А вось жартаваць з бяспекай, абараназдольнасцю нашых рубяжоў ні ў якім разе нельга. Гэта не падлягае ніякаму віду гандлю», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы паставіў адной з галоўных мэт забяспечыць празрыстасць падзеі, запрасіць назіральнікаў на ёй усіх ахвотных. Каб вучэнні былі даступныя не толькі для сяброў Беларусі па АДКБ, ЕАЭС, СНД, але і для прадстаўнікоў Паўночнаатлантычнага блока — НАТА. «Мы нічога не хаваем і хаваць не павінны. Калі натаўцы хочуць прысутнічаць на нашым вучэнні, калі ласка», — прапанаваў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама папрасіў удзяліць увагу абмеркаванне задумы вучэнняў «Захад-2017» даць ацэнку эфектыўнасці двухбаковага ваеннага супрацоўніцтва з Расіяй, бо ў хуткім часе мусіць адбыцца Вышэйшы дзяржаўны савет Саюзнай дзяржавы. «Калі ёсць нейкія праблемы, каб я мог іх пазначыць перад кіраўніцтвам Расіі і прыцягнуць увагу да больш эфектыўнага супрацоўніцтва ў рамках нашых пагадненняў па абароне Саюзнай дзяржавы», — растлумачыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў задуму сумеснага стратэгічнага вучэння Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017».

Таксама падчас абмеркавання Прэзідэнт адзначыў факты супрацьпраўных дзеянняў на дзяржаўнай граніцы, якія адбываюцца час ад часу: спробы правезці зброю і іншыя небяспечныя прадметы. Ён расказаў пра начную падзею на беларуска-ўкраінскай мяжы, калі давялося ўжыць зброю. «І на заходнім напрамку выяўленыя былі нядобрыя дзеянні, звязаныя з гранатамі, начыненымі нейкім парашком (зараз праводзіцца даследаванні)», — паведаміў Прэзідэнт. Яшчэ адзін інцыдэнт звязаны са знаходкай радыеактыўных рэчываў на борце самалёта, які рухаўся транзітам цераз Беларусь з Арменіі ў адну з еўрапейскіх краін. Кіраўнік дзяржавы даручыў праінфармаваць яго па выніках расследавання.

* * *

Пра падрабязнасці маючых адбыцца вучэнняў журналістам расказаў **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ**. Ён падкрэсліў, што яны, хутчэй, гэта спосаб падрыхтоўкі рэгіянальнай групоўкі войскаў, якая з'яўляецца гарантам Саюзнай дзяржавы на заходнім напрамку. Пры гэтым прасторавых размах «Захаду» ўражвае — ад Кольскага напрамку ў арктычнай зоне да Беларусі. На тэрыторыі нашай краіны будзе задзейнічана 7 палігонаў і ўчасткаў мясцовасці для рэгіянальнай групоўкі войскаў. Галоўная тэматыка вучэння, падкрэсліў міністр, — абарончая. Іх задача — гэта падрыхтаваць і праверыць гатоўнасць рэгіянальнай групоўкі войскаў. І тут ключавы складнік — абаранальны.

Пры гэтым агульная колькасць прыцягнутых войскаў не будзе перавышаць тых параметраў, што вызначаны Венскім дакументам 2011 года. Гэта не больш за 13000 ваенных па асабістым складзе. Ад расійскага боку плануецца каля 3000 ваеннаслужачых і каля 280 адзінак тэхнікі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# ЦЭНЫ, ЗАНЯТАСЦЬ, ЗАРПЛАТА

## Ключавыя словы задач, пастаўленых Прэзідэнтам перад прызначанымі намеснікамі старшынь Мінгарвыканкама

**Учора кіраўнік дзяржавы прыняў шэраг рашэнняў па прызначэнні на кіруючыя пасады ў сталіцы. Такім чынам Мінск займеў чатырох новых кіраўнікоў.**

Гэта Фёдар Рымашэўскі, яшчэ да нядаўняга часу генеральны дырэктар «Мінскбуда», цяпер — першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама. Аляксандр Крапак, да гэтага кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна сталіцы, стаў намеснікам старшыні гарвыканкама. Адпаведна, раней займаемую ім пасаду заняў Андрэй Жайловіч, экс-намеснік кіраўніка адміністрацыі Партызанскага раёна. Яшчэ адзін новы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар Юркевіч, да гэтага ўзначальваў сталічны камітэт па ахове здароўя.

Перад новапрызначанымі Прэзідэнт паставіў тры задачы: урэгуляваць цэны, забяспечыць рост заработнай платы і вырашыць пытанне занятасці людзей. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сёння горад функцыянуе як след, аднак узровень развіцця сталіцы мог бы быць на парадак вышэйшым.

Што датычыцца ўзроўню заработнай платы, то, на думку Прэзідэнта, казаць пра сярэднюю зарплату ў Мінску ў $500 — смешна. У сталіцы яна павінна быць значна вышэйшай, чым у рэгіёнах. Тады гэта павысіць і сярэдні заробак па краіне. Але вырашэнне гэтых задач пацягне за сабой і вырашэнне іншых: павышэнне прадукцыйнасці працы, аб'ёмаў вытворчасці, рост продажаў.

Яшчэ адна задача — барацьба з беспрацоўем. Тым больш што, па словах Прэзідэнта, пачынаючы з вясны, работы ў Мінску хоць адбаўляй. «Сёння трэба задзейнічаць усіх, хто ходзіць без працы. Тым, хто хоча ўладкавацца на работу і можа працаваць, трэба дапамагчы. Хто не хоча (такіх усё ж такі менш), трэба прымусіць працаваць. Таму зрабіце ўсё, каб па максімуме заняць людзей», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Па словах кіраўніка дзяржавы, вырашэнне трох задач — кантроль за ростам цэн, рост заробкаў і забеспячэнне занятасці — адначасова вырашыць усе астатнія, супакоіць незадаволенасць насельніцтва. «Мы павінны выстаяць і даказаць усім, што мадэль сацыяльнай дзяржавы — гэта аптымальная мадэль для бяспечнай дзяржавы, якая нармальна развіваецца», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым, заўважыў Прэзідэнт, не варта ламаць існуючую сістэму, заяўляючы аб неабходнасці яе рэфармавання. Трэба паляпшаць тое, што ёсць. Бо для таго, каб збудаваць новае, жыцця не хопіць. «Мы павінны ўдасканальваць тое, што ёсць. Бяздзейнасць я не пацярплю. Я вам кажу шчыра: ці вы пачынаеце дзейнічаць і даяце вынік, выконваеце даручэнні Прэзідэнта, ці я буду прымаць рашэнні, прытым самыя сур'ёзныя, — адзначыў Прэзідэнт. — Мінск з кожным месяцам павінен выглядаць інакш: лепш, лепш і лепш. Каб паказаць прыклад усёй краіне».

* * *

**Фёдар РЫМАШЭЎСКІ, першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама:**

— Перад намі былі пастаўлены задачы па вырашэнні сацыяльных і эканамічных пытанняў горада. Адна з задач датычыцца заработнай платы. Яна, зразумела, павінна не выплачвацца, а зарабляцца. Для гэтага мы будзем імкнуцца забяспечыць загрузку нашых прадпрыемстваў.

* * *

**Аляксандр КРАПАК, намеснік старшыні Мінгарвыканкама:**

— У першую чаргу кіраўнік дзяржавы даў даручэнне павысіць эфектыўнасць працы ва ўсіх галінах жыццядзейнасці для таго, каб палепшыць якасць жыцця насельніцтва. Гэта датычыцца і цэнавой палітыкі ва ўсіх сферах, у тым ліку жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Прэзідэнт таксама звярнуў увагу на работу прадпрыемстваў прамысловага комплексу: нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці, рэалізацыі гатовай прадукцыі, экспарту.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# «УВАЖЛІВА СТАЎЦЕСЯ ДА ЛЮДЗЕЙ!»

**На прамую лінію да старшыні Брэсцкага аблвыканкама Анатоля ЛІСА ў мінулую суботу дазваніўся 31 чалавек. Пытанні былі самыя розныя. Як заўсёды, людзі гаварылі пра хібы ў добраўпарадкаванні, пра недахоп інфраструктуры ў раёнах новых прыватных забудоў, былі звароты і па асабістых праблемах.**


Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Такое ўражанне, што жанчына са Столінскага раёна хацела выгаварыцца, падзяліцца сваёй бядой. Зяць пакінуў сям'ю і не плаціць аліменты на ўтрыманне дваіх дзяцей. Пра гэтага гора-бацьку ведаюць у мясцовым выканкаме, у праваахоўных органах. Ён нават на год быў пазбаўлены волі за ўхіленне ад аплаты аліментаў. Але на шлях выпраўлення не стаў. Жыве без рэгістрацыі ў Брэсце, на работу ісці не спяшаецца. У міліцыі сказалі, што неўзабаве зноў накіруюць у месцы пазбаўлення волі. Але жанчына не згаджаецца: «Што толку ў яго адсідках?» Ды толькі вярнуць чалавеку сумленне і прымусіць зарабляць грошы для дзяцей ніхто не можа. «Чым можна дапамагчы ў такой сітуацыі? — разважаў губернатар. — Даручыць органам правапарадку яшчэ раз звярнуць увагу на злоснага неплацельшчыка».

Фактычна на кожнай прамой лініі бывае хоць адно падобнае пытанне, паспрыяць у вырашэнні якога вельмі складана, а то і немагчыма. Бо за свае памылкі, у тым ліку з абраннем спадарожніка жыцця, даводзіцца расплачвацца асабіста кожнаму.

А вось іншыя пытанні, якія ўздымалі жыхары вобласці, патрабуюць умяшальніцтва органаў улады на месцах. Так, на прамую лінію патэлефанавала старшыня грамадскай арганізацыі «Асаблівае дзяцінства», якая прадстаўляла яшчэ адну арганізацыю — «Інвалід і асяроддзе», і папрасіла дапамогі. Рэч у тым, што брэсцкія інваліды маюць свае майстэрні па вытворчасці розных сувеніраў. Раней большую частку прадукцыі яны рэалізоўвалі праз ЦУМ. Некалькі месяцаў таму цэнтральны ўніверсальны магазін быў прададзены, новы ўласнік закрыў яго на рэканструкцыю. Інваліды засталіся без гандлёвай пляцоўкі. А для многіх людзей гэта адзіная крыніца папаўнення бюджэту, акрамя сціплай пенсіі. Кіраўнік вобласці тут жа даў даручэнне гарвыканкаму. Аддзел гандлю гарадской адміністрацыі павінен прыняць усе меры, каб забяспечыць людзей магчымасцю прадаваць свае вырабы. «Уважліва стаўцеся да людзей!» — прасіў губернатар усіх прысутных на прамой лініі чыноўнікаў.

Заклік аб уважлівым стаўленні прагучаў і пасля звароту жыхара Камянца. Валерый Васілевіч будуе ў райцэнтры дом. Як і ўсе забудоўшчыкі, ён скарыстаўся паслугамі мясцовага ЖКГ па ўрэзцы труб. Спецыялісты прыехалі, зрабілі работу за паўгадзіны, выставілі рахунак на 200 рублёў. Але заяўнік сам інжынер, працаваў у такой жа сістэме і расцэнкі ведае. Ён звярнуўся па тлумачэнні ў абласную ЖКГ, адтуль пісьмова адказалі, што работа каштуе прыкладна 56 рублёў. Ды толькі камянецкія камунальнікі стаяць на сваім: прадстаўляюць нейкія толькі ім вядомыя разлікі і з кожным новым пісьмом прыбаўляюць капейкі ў выніковай суме. Разборкі цягнуцца больш за паўгода. І чалавек ужо крыўдна не толькі за грошы, але і за справядлівасць. Чаму па ўсёй вобласці паслуга каштуе столькі, а ў Камянцы ў разы даражэй? Кіраўнік вобласці даў строгае ўказанне спыніць гэтую валакіту, а мясцовым кадрам адпаведным чынам указаць на пралікі альбо памылкі і прымусіць выправіць свае хібы.

А вось пытанне пенсіянеркі з Пружан нават крыху здзівіла прысутных. Алена Несцераўна скардзілася, што на могілках вёскі Сухопаль шмат старых дрэў, якія становяцца пагрозай для помнікаў. Вядома, дрэвы трэба спілоўваць. Здавалася б, гэтыя пытанні ўсюды вырашаюцца сельскімі Саветамі разам з жыхарамі. Людзі збіраюць грошы, мясцовы орган улады арганізоўвае знос лішняй расліннасці. Аказваецца, не ўсюды. Вось і заяўніцы парэкамендавалі звярнуцца ў сельскі Савет, а таксама паўдзельнічаць у фінансаванні гэтай справы.

Некалькі зваротаў на прамую лінію ў мінулую суботу ўтрымлівалі не скаргі альбо просьбы, а прапановы. Так, пенсіянер з Брэста мае асабістую заканадаўчую ініцыятыву. Не больш, не менш. Мікалай Сцяпанавіч, як і многія грамадзяне, аформіў крэдыт на прыватызацыю ўласнай кватэры тэрмінам на 40 гадоў. Ён кажа, што гатовы выплаціць яго раней, але на выгадных умовах. Скажам, каб за ўнесены рубель налічвалася паўтара ці больш. Такая сістэма, паводле разлікаў самога пенсіянера, выгадная і для дзяржавы, бо грошы, унесеныя сёння, прынясуць большую карысць, чым тая ж сума праз 30—40 гадоў. Вядома, пэўная логіка ў разважаннях чалавека ёсць. Толькі справа патрабуе вельмі сур'ёзнага вывучэння са праўды на ўзроўні заканадаўцаў.

Яшчэ адзін з аўтараў зваротаў, кіраўнік брэсцкага велаклуба, мае прапановы па праграме развіцця веласіпеднай інфраструктуры абласнога цэнтра на наступныя пяць гадоў. Аляксандра Віктаравіча запрасілі ў гарвыканкам, дзе абяцалі падрабязна азнаёміцца з напрацоўкамі і прыняць іх да ўвагі асабліва пры праектаванні новых аб'ектаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# Пытанні, якія вырашаюцца

**На прамой лініі з выконваючым абавязкі старшыні Жодзінскага гарвыканкама Сяргеем КОНАНАМ прысутнічала і карэспандэнт «Звязды». Падчас дыялогу з жыхарамі горада аператыўна вырашалі праблемы хібаў у рабоце ЖКГ і даводзілі да ведама інфармацыю па зямельных участках. Пытанні па транспарце і працаўладкаванні гарвыканкам таксама трымае на кантролі.**

Так, цяпер шукаюць работу для чалавека з абмежаванымі магчымасцямі. Некаторы час таму ён звярнуўся ў выканкам з такой просьбай, і зараз спецыялісты гатовы прапанаваць яму некалькі месцаў.

Часам людзі тэлефануюць у пошуках інфармацыі. Сям'я мае сваіх дваіх дзяцей і жадае ўзяць яшчэ аднаго з інтэрната. Ці будзе ім у гэтым выпадку, як шматдзетнай, выдзелены зямельны ўчастак у Жодзіне? Сяргей Конан адказвае: «Сёння ў нас ёсць восем шматдзетных сямей, якія хочуць атрымаць зямельны надзел для будаўніцтва. У нас ёсць чатыры зямельныя ўчасткі, якія мы можам аддаць. Зараз іншых свабодных зямель няма, і мы працуем на ўшчыльненне. Мы знаходзім землі, якія выкарыстоўваліся пад іншыя патрэбы, фарміруем участак і выдзяляем шматдзетнай сям'і. Гэты працэс ідзе ўвесь час».

Сярод гарадскіх пытанняў — будаўнічыя работы на вуліцы Фрунзэ. Цяпер па звароце грамадзяніна будуць высвятляць, хто і чаму праводзіць іх у суботу. Шум замінае тым, хто жыве па суседстве, таму, вядома, неабходна, каб работы праводзіліся ў будныя дні.

Адна з гараджанак скардзілася на птушак. Маўляў, гракі і вароны будуюць гнёзды, крычаць. Але па законе ўстаноўлены канкрэтны тэрмін, калі гнёзды можна здымаць. На практыцы абрэзку дрэў і знясце гнёздаў штогод праводзяць у дазволены перыяд.

Гэта была ўжо дзясятая прамая лінія ў гэтым годзе. За папярэднія дзевяць з пытаннямі звярнуліся 34 гараджаніны. Прычым 62% зваротаў тычыліся недахопаў, звязаных з жыллёва-камунальнай гаспадаркай. У асноўным пытанні вырашаюцца аператыўна.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■

■ Экзаменацыйны расклад

# КАЛІ АДШУМЯЦЬ ВЫПУСКНЫЯ Ў ШКОЛАХ?

**Міністэрства адукацыі вызначылася з датамі правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, звязаных з заканчэннем навучальнага года, і выпускнымі экзаменамі. Апошнія званкі для вучняў 9-х і 11-х класаў прагучаць у гэтым годзе 30 мая. А вучэбны год для ўсіх школьнікаў завяршаецца 31 мая. Выпускныя вечары для адзінаццацікласнікаў Міністэрства адукацыі рэкамендуе правесці 9—10 чэрвеня 2017 года.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

З 1 па 10 чэрвеня ў школах пройдуць выпускныя экзамены на II і III ступенях навучання.

Выпускнікі 11-х класаў будуць здаваць чатыры абавязковыя экзамены. Пісьмовыя іспыты па рускай або беларускай мове (па выбары) і матэматыцы пройдуць 1, 3 і 5 чэрвеня 2017 года. Тэксты і заданні для правядзення выпускных экзаменаў у пісьмовай форме будуць аб'яўляцца праз сродкі масавай інфармацыі, а таксама размяшчацца на партале Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Навучэнцы сярэдніх школ, у якіх было арганізавана вывучэнне гэтых прадметаў на павышаным узроўні, будуць пісаць пераказ і экзаменацыйную работу па матэматыцы па іншых заданнях. Акрамя таго, адзінаццацікласнікам трэба будзе здаць экзамен па замежнай мове і гісторыі Беларусі.

Пасля заканчэння базавай школы вучні будуць здаваць тры экзамены: беларускую мову (дыктоўку), рускую мову (дыктоўку) і матэматыку (пісьмова). Даты правядзення пісьмовых экзаменаў — 2, 6 і 8 чэрвеня.

Ва ўстановах адукацыі, дзе навучанне і выхаванне вядзецца на польскай і літоўскай мовах, для навучэнцаў 9-х і 11-х класаў праводзяцца выпускныя экзамены ў пісьмовай форме па мове нацыянальнай меншасці: 24 мая — у 9-х класах і 25 мая — у 11-х класах.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пры правядзенні выпускных экзаменаў у пісьмовай форме (за выключэннем выпускнога іспыту па матэматыцы) у класах інтэграванага навучання і выхавання ствараюцца дзве экзаменацыйныя камісіі і выдзяляюцца два асобныя памяшканні для правядзення выпускных экзаменаў.

На Нацыянальным адукацыйным партале (http://adu.by/) у раздзеле «Вучню» (падраздзеле «Экзамены») можна знайсці экзаменацыйныя білеты па гісторыі Беларусі, якую ў абавязковым парадку здаюць усе выпускнікі 11-х класаў. Экзаменацыйныя білеты распрацаваны асобна для базавага і павышанага ўзроўню вывучэння прадмета. Між іншым, гэта першы год, калі выпускнікі сярэдняй школы будуць здаваць гісторыю Беларусі, ахопліваючы ўвесь курс: ад старажытных часоў да пачатку XXI стагоддзя.

Таксама на Нацыянальным адукацыйным партале ў тым жа раздзеле прадстаўлены і Праграмы ўступных іспытаў ва ўстановы адукацыі для атрымання вышэйшай адукацыі I ступені і (або) сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2017 год.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

**ПРАМАЯ ЛІНІЯ**

**НА СУВЯЗІ — МАСТЫ**

Чарговая прамая лінія рэдакцыі газеты «Звязда» пройдзе заўтра, 22 сакавіка, сумесна са **старшынёй Мастоўскага райвыканкама Юрыем Мікалаевічам ВАЛЯВАТЫМ**. Кіраўнік раёна адкажа на вашы пытанні з 12.00 да 13.00. Звяртайцеся па тэлефоне (8-015-15) 333-24.

■ Надвор'е

# Дажджліва і цёпла

**А ў сераду сіноптыкі абяцаюць, што прыгрэе да плюс 17 градусаў**

**Чакаецца, што на гэтым тыдні тэмпературны фон падвысіцца, але ў асобныя ночы яшчэ будзе падмарожваць, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

У аўторак пад уплывам атмасферных франтоў, якія змяшчаюцца з боку Заходняй Еўропы, на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 5—11 цяпла, а на паўднёвым захадзе прагназуецца нават да плюс 12—15 градусаў. У сераду ўначы пераважна ў заходніх і ўсходніх раёнах Беларусі, а ўдзень пад уплывам чарговай сістэмы атмасферных франтоў на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ад плюс 1 да плюс 6 градусаў. Удзень чакаецца 3—10 цяпла, а па паўднёвым усходзе — нават ад плюс 11 да плюс 17 градусаў.

У чацвер уначы кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі месцамі па паўднёва-ўсходняй частцы краіны. Удзень увогуле будзе без ападкаў, толькі ў паўднёвых і заходніх раёнах магчымы невялікія кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў да 3 цяпла, па паўднёвым усходзе — да плюс 6. Удзень прагназуецца 7—12 цяпла, а па поўдні — да плюс 14 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пятніцу на тэрыторыю краіны завітае чарговая хваля атмасферных франтоў. Таму ўначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі краіны, а ўдзень толькі ў асобных раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень будзе ўвогуле камфортна і 7—14 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ На слыху

# ПАГРАНІЧНІКІ ПАПЯРЭДЗІЛІ СПРОБУ ПРАРЫВУ НА БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАЙ МЯЖЫ

**У ноч на 20 сакавіка ў пункце пропуску «Аляксандраўка» на тэрыторыю Беларусі з Украіны незаконна ўехаў аўтамабіль. Пры гэтым транспартны сродак знёс шлагбаум, праехаў праз сродак прымусовага прыпынку, атрымаўшы механічныя пашкоджанні, і яго кіроўца паспрабаваў праравацца ўглыб нашай тэрыторыі.**

— У мэтах затрымання аўтамабіля супрацоўнікі органаў пагранічнай службы прымянілі табельную зброю, — расказаў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Беларусі Антон БЫЧКОЎСКІ**. — Дзякуючы злажанай рабоце аператыўнай групы Дзяржпагранкамітэта транспартны сродак быў спынены непадалёк ад пункта пропуску. У выніку затрыманы двое грамадзян, асобы якіх устанаўліваюцца следчымі органамі. У гэтым аўтамабілі мог знаходзіцца яшчэ адзін невядомы, пошукі якога ў цяперашні час вядуцца.

Вядома, што падчас знешняга агляду аўтамабіля быў знойдзены пісталет маркі ТТ і два начыненыя магазіны, а таксама прадмет, знешне падобны да тратылу і электрадэтанатараў. Праводзяцца аператыўна-следчыя мерапрыемствы. Пакуль невядома, адкуль прыбылі парушальнікі.

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

* * *

Тым часам прадстаўнікі Дзяржаўнага пагранкамітэта расказалі і аб іншых інцыдэнтах, выяўленых за апошнія дні на нашай мяжы. Так, у Гомелі на транзітным грузавым самалёце, які ляцеў з Арменіі ў Балгарыю, знойдзены груз з перавышэннем радыяцыйнага фону ў 250 разоў. Гэта была скрынка, на якой мелася абазначэнне іанізуючай крыніцы. Пасля неабходных праверак груз быў прапушчаны праз дзяржаўную граніцу Беларусі.

А ў Нацыянальным аэрапорце Мінск у ходзе пагранічнага кантролю пасажыраў рэйса Кіеў—Мінск выяўлены грамадзянін Японіі 1969 года нараджэння, які знаходзіцца ў спісе асоб, уезд якіх на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь закрыты або непажаданы. У ходзе разбору ўстаноўлена, што ён знаходзіўся на тэрыторыі Украіны і Ірака падчас вядзення баявых дзеянняў, пра што сведчылі адзнакі ў пашпарце замежніка. Акрамя таго, аналіз адкрытых крыніц інфармацыі паказаў, што грамадзянін Японіі затрымліваўся на тэрыторыі Ірака па падазрэнні ў дачыненні да дзейнасці тэрарыстычнай арганізацыі «Ісламская дзяржава» ў кастрычніку 2016 года. У выніку японца ў Беларусь не пусцілі.

У нядзелю ў пункце пропуску «Брэст» беларускія памежнікі выявілі муляж гранаты ў рэйсавым аўтобусе, які рухаўся з Германіі ў Расію. У ім знаходзілася рэчыва ў выглядзе парашку белага колеру. Па словах прадстаўніка Дзяржпагранкамітэта, муляж гранаты знаходзіцца на экспертызе, праваяраецца яго прыналежнасць да выбуховых устройстваў, а таксама парашок, які ў ім знаходзіўся

■

■ Добрая навіна

# Прыём пацыентаў пад пільным кантролем

**У Гомельскай абласной клінічнай бальніцы пасля рамонту, які каштаваў каля Br550 тысяч, адкрылі прыёмнае аддзяленне.**

Праведзены рамонт кардынальна закрануў не толькі працоўныя месцы дзяжурных урачоў і медыцынскіх сясцёр, якія сёння абсталяваны персанальнымі камп'ютарамі, звязанымі ў адзіную бальнічную сетку. Каля ўвахода — крытая эстакада для заезду машын хуткай медыцынскай дапамогі. З улікам сучасных патрабаванняў тут створана безбар'ернае асяроддзе. Для кантролю дзейнасці ўсталявана сучасная відэа- і аўдыяапаратура.

Як расказала **загадчыца аддзялення Людміла СКРЭБНЕВА**, штодзень у аддзяленне звяртаецца каля 200 пацыентаў, прычым каля 40% з іх па экстранную дапамогу:

— У аддзяленні дадаткова створаны кабінеты ўльтрагукавога даследавання і электракардыяграфіі, што дазволіць больш аператыўна атрымліваць вынікі даследаванняў. Раней для правядзення такіх абследаванняў пацыентаў накіроўвалі ў аддзяленні стацыянара, якія размешчаны на розных паверхах.

На чарзе другі этап рэканструкцыі прыёмнага аддзялення. Як адзначыў **намеснік галоўнага ўрача бальніцы Аляксандр ШУКАЙЛАЎ**, у планах пашырэнне плошчаў, што дасць магчымасць падзяліць патокі планавых і экстранных пацыентаў. Да таго ж у аддзяленні павінен з'явіцца сучасны цэнтр тэлемедыцынскага кансультавання. З яго дапамогай можна будзе звязацца са сталічнымі калегамі, а ўрачам з раённых медустаноў аператыўна пракансультавацца ў абласных спецыялістаў. Другі этап рамонтных работ павінен завяршыцца сёлета ў верасні.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Здарэнне

# ПТУШКІ «ПАСАДЗІЛІ» БОРТ

**Самалёт «Белавія» сутыкнуўся з чарадой птушак і мусіў вярнуцца ў Нацыянальны аэрапорт «Мінск».**

Як паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі, самалёт рэйса B2-945 Мінск — Санкт-Пецярбург вярнуўся ў аэрапорт адразу пасля ўзлёту. Борт вылецеў 19 сакавіка ў 18.05. На вышыні каля 150 метраў адбылося яго сутыкненне з птушкамі. Камандзір экіпажа прыняў рашэнне вяртацца ў Нацыянальны аэрапорт. Паветранае судна выпрацавала паліва і паспяхова ажыццявіла пасадку. Падчас інцыдэнту ніхто не пацярпеў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■

■ Беражыце сябе!

# Першая ахвяра вясенняга выпальвання



**Вось ужо тыдзень урачы Клімавіцкай раённай бальніцы змагаюцца за жыццё 96-гадовай жыхаркі вёскі Шасцёраўка, якая атрымала на пажары апёкі 40% паверхні цела.**

**Інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Клімавіцкага аддзела па надзвычайных сітуацыях Раман ПЯСЬКОЎСКІ** паведаміў, што прычынай няшчаснага выпадку стала спальванне сухой расліннасці і смецця. Сваячка пенсіянеркі расклала вогнішча на некаторай адлегласці ад дома, але пад парывам ветру полымя перакінулася на жылую пабудову, і тая загарэлася. Жанчына кінулася ратаваць гаспадыню, але спатрэбіўся час, каб вывесці старога чалавека церaз ахопленую агнём веранду.



Пажар знішчыў дах дома, пашкодзіў сцены і маёмасць.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Магілёўскага абласнога ўпраўлення МНС, на 20 сакавіка дапамога ратавальнікаў ва ўтаймаванні палаючай расліннасці спатрэбілася ўжо 43 разы. Супрацоўнікі гэтай службы не перастаюць нагадваць, каб насельніцтва не стварала ўмовы для пажару пры навядзенні парадку каля сваіх дамоў.

Акрамя таго, што парушэнне правілаў пажарнай бяспекі небяспечна для жыцця, гэта можа каштаваць яшчэ і грошай. За выпальванне сухой расліннасці, травы на корані, а таксама ржышча на палях, альбо непрыняцце мер па ліквідацыі гэтых надзвычайных сітуацый грамадзяне і кіраўнікі нясуць адказнасць у выглядзе штрафу ад 10 да 40 базавых велічынь. Калі агонь нанёс істотную шкоду маёмасці або здароўю чалавека, вінаватаму пагражае крымінальная адказнасць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■

# СВАЁ — ЗАЎСЁДЫ НАЙЛЕПШАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Трэба сказаць, што ў сферы бульбаводства існуюць пэўныя праблемы, — адзначае **намеснік генеральнага дырэктара па навуковай рабоце Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Вадзім МАХАНЬКО.** — Так, напрыклад, агульныя пасяўныя плошчы працягваюць скарачацца. Дзесяць гадоў таму больш за тысячу гаспадарак займаліся вырошчваннем бульбы, сёння — усяго 460. Але адзначу, што валавы збор пры гэтым не зменшыўся — ён застаецца на ўзроўні, большым за мільён тон. Са 150 сартоў, што культывуюцца ў нашай краіне, толькі 47 — айчыннай селекцыі, але менавіта яны займаюць 70—75 працэнтаў плошчаў».

Сярод цікавых работ бульбаводаў можна вылучыць праект па распрацоўцы тэхналогій вытворчасці бульбы рознага прызначэння. Усе яны праходзяць «абкатку» на базавым прадпрыемстве НПЦ — Талачынскім кансервавым заводзе. Летась у падсобнай гаспадарцы было высаджана больш за ўсё бульбы ў параўнанні з іншымі аграрнымі прадпрыемствамі і была атрымана найлепшая ўраджайнасць — 50 тон з гектара. Самымі прадуктыўнымі сталі два беларускія сарты: «Палац» і «Лель», якія з гэтага года ўключаны ў Дзяржаўны рэестр. Што датычыцца пладаводства, то цяпер распачалася работа па атрыманні пасадачнага матэрыялу такіх культур «у прабірках» — гэта дазваляе забяспечыць высокі каэфіцыент размнажэння, а таксама абараніць расліны ад шматлікіх хвароб. З новых сартоў спецыяліст адзначыў грушу «Проста Марыя» асенняга тэрміну выспявання, якая вылучаецца вялікім памерам пладоў і добра прадаецца.

«У Беларусі сапраўды адзначаюцца пэўныя змяненні клімату, якія выражаны ў тым ліку пацяпленнем і дэфіцытам ападкаў у пэўных абласцях, — сцвярджае **намеснік дырэктара па навуцы Інстытута абароны раслін Алена ЯКІМОВІЧ.** — Гэта, у сваю чаргу, прыводзіць да з'яўлення новых відаў хвароб, якія не сустракаліся ў нас раней, напрыклад, пірэнафарозу (жоўтай плямістасці) ці жоўтай іржы. На поўдні пачынаюць з'яўляцца новыя шкоднікі — летась выявілі хлебнага жужаля, які пашкоджвае пасевы азімых збожжавых. У Брэсцкай і Гомельскай абласцях у апошнія гады вельмі актыўна паводзіць сябе азімая соўка. Цёплая восень дае магчымасць развівацца шведскім мухам, цыбловаму кукурузнаму матыльку».

А вось з пустазеллем сітуацыя за апошнія гады, наадварот, палепшылася. Па словах спецыяліста, калі ў 1980-я колькасць раслін-шкоднікаў на адным квадратным метры перавышала норму, то цяпер яна знаходзіцца на мяжы шкоднасці. Негатыўнае ўздзеянне шматгадовага пустазелля зменшылася прыблізна ў пяць разоў. Асобна можна вылучыць распрацоўку шэрагу мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам Сасноўскага — у Дзяржаўны рэестр быў уключаны дзясятак гербіцыдаў, якія паказваюць вельмі высокую эфектыўнасць у барацьбе з гэтым відам. Па словах навукоўца, у сталіцы праблема з гэтай раслінай ужо практычна вырашана.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Шляхі-дарогі

# ПЕРАВОЗЧЫКАМ БУДЗЕ ПРАСЦЕЙ

## А ў Мінтрансе чакаюць прыходу лаўкостаў

**У заканадаўства ў сферы транспарту плануецца ўнесці каля 250 змяненняў у бок спрашчэння, паведаміў міністр транспарту і камунікацый Анатоль СІВАК. Паводле яго слоў, такая мера павінна стымуляваць развіццё транспартнага прадпрымальніцтва ў краіне. Сярод змяненняў, якія будуць рэалізаваны, міністр назваў адмену планавых праверак пераважна ў аўтатранспартным бізнесе, дзе працуюць дробныя прыватныя кампаніі. Плануецца праводзіць такія працэдуры толькі па фактах здарэнняў, якія прывялі да праблем са здароўем або жыццём пасажыраў.**

Анатоль Сівак таксама расказаў пра тарыфы на пасажырскія перавозкі ў бягучым годзе. Міністр адзначыў, што павышаць іх пакуль не плануецца. Эканамічнае абгрунтаванне гэтага рашэння — паказчык самаакупнасці пасажырскіх перавозак, які знаходзіцца на ўзроўні 64,2 працэнта. У бюджэт краіны закладзена лічба ў 65 працэнтаў самаакупнасці, дасягнуць яе можна без павышэння тарыфаў — пры дапамозе комплексу мерапрыемстваў па павышэнні эфектыўнасці, скіраваных на скарачэнне выдаткаў.

— Што датычыцца платных дарог, то рэзкіх рашэнняў па павелічэнні іх колькасці ў Беларусі не будзе, — сказаў міністр. — На сёння мы маем 1600 кіламетраў такіх магістраляў. Грошы, затрачаныя на абсталяванне, акупіліся яшчэ год таму. Цяпер гэтыя транспартныя артэрыі прыносяць чыстыя прыбыткі ў бюджэт дзяржавы. Калі казаць пра другую Мінскую кальцавую аўтадарогу, то планаў па ператварэнні яе ў платную ў нас няма. Мы будзем імкнуцца пры дапамозе знакаў пераводзіць туды транзітны транспарт, асабліва міжнародны, каб не загружаць МКАД. Пакуль што мы гэтага не рабілі, бо там былі пэўныя абмежаванні, у тым ліку па максімальнай хуткасці. Што датычыцца загрузкі гэтай дарогі, то летась у перыяды піку яна дасягала 4 тысяч аўтамабіляў за суткі. Па нарматывах пры загрузцы ў 10 тысяч машын магістраль трэба планаваць пад першую катэгорыю, гэта чатыры паласы. Увогуле, будаўніцтва сябе апраўдвае, акрамя таго, вакол сталіцы з'явіўся інвестыцыйны пояс, які дасць штуршок развіццю эканомікі.

Міністр таксама адказаў на пытанне пра магчымы прыход у Беларусь лаўкоставых авіяперавозчыкаў. На яго думку, з'яўленне бюджэтных кампаній у нашай краіне залежыць у першую чаргу ад іх саміх. Праблема на сёння заключаецца ў эканамічнай мэтазгоднасці такіх палётаў у Беларусь для саміх перавозчыкаў. Анатоль Сівак адзначыў, што авіякампанія «Белавія» ўжо мае ў сваім раскладзе рэйсы, якія па прынцыпах работы блізкія да лаўкостаў, як, напрыклад, маршрут Мінск — Жукоўскі. Ён таксама падкрэсліў, што калі ў каго-небудзь з бюджэтных перавозчыкаў з'явіцца жаданне адкрыць рэйс у Мінск, ніякіх перашкод для гэтага не будзе. Наадварот, Мінтранс збіраецца спрыяць такім ініцыятывам.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*



Фота БЕЛТА.

■ А не шкодзь!

## Як адзін акунь «пад артыкул» падвёў

На возеры каля вёскі Міхнавічы Калінкавіцкага раёна работнікі Мазырскай міжрайінспекцыі затрымалі двух жыхароў Калінкавіч, якія 90-метровай сеткай незаконна здабылі 24 асобіны розных відаў рыб агульнай вагой больш за дзевяць кілаграмаў, у тым ліку дзевяць шчупакоў, вылаў якіх зараз забаронены.

Інспектары падлічылі нанесеную прыродзе шкоду. Яна склала крыху менш за 100 базавых велічынь. Быў распачаты адміністрацыйны працэс. Аднак гісторыя для браканьераў мела нечаканы працяг...

— У мяшку, дзе парушальнікі хавалі ўлоў, пры паўторным пераліку інспектар выявіў яшчэ аднаго акуня, які прыліп да сценкі, а ў вырашальны момант выпаў на зямлю, — расказалі ў Дзяржінспекцыі. — Гэта цалкам змяніла ход далейшых падзей. Сума нанесенай шкоды перавысіла адзнаку ў 100 базавых велічынь. А ў адпаведнасці з заканадаўствам у такім выпадку наступае крымінальная адказнасць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Па сутнасці справы

# РАБОТА ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Камісія, якая разглядае звароты грамадзян па вызваленні ад збору па Дэкрэце №3, працягвае сваю работу, расказаў карэспандэнту газеты намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Дзмітрый ПАЛХОЎСКІ. Дзеянне дэкрэта прыпынена, але камісію ніхто не адмяняў.**

Яшчэ раней спісы патэнцыйных плацельшчыкаў разглядалі на пасяджэннях сельскіх выканаўчых камітэтаў з удзелам прадстаўніка райвыканкама, спецыяліста падатковых органаў, участковага міліцыянера. Да вывучэння кожнай кандыдатуры падышлі ўсебакова. Такім чынам сфарміраваўся спіс з асоб, якім было рэкамендавана звяртацца ў раённую камісію з просьбай аб вызваленні ад выплаты. «Гэта найперш людзі, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, — растлумачыў Дзмітрый Георгіевіч. — Знайшлося ў кожным сельсавеце нямала вяскоўцаў, якія вядуць, хай сабе невялікую, падсобную гаспадарку і за кошт гэтага жывуць, бо на дадзеным прамежку часу яны не змаглі ўладкавацца на працу».

Яшчэ намеснік старшыні райвыканкама звярнуў увагу на шэраг тэхнічных момантаў, якія, ён спадзяецца, будуць выпраўлены ў новай рэдакцыі дакумента. Напрыклад, адзін з жыхароў Пінскага раёна пяць гадоў таму выехаў на жыхарства ў Казахстан. У сельскім Савеце пра тое ведаюць і могуць пацвердзіць. Але падобная даведка мясцовага органа ўлады не з'яўляецца падставай для выключэння яго са спісаў. Падатковы орган гатовы разглядаць даведку з новага месца жыхарства, якую прыслаў бы сам грамадзянін. А ён не лічыць гэта патрэбным. Атрымліваецца, як кажуць праваахоўнікі, «вісяк». І такіх прыкладаў нямала.

Здараліся выпадкі, калі чалавеку літаральна не хапіла аднаго-двух дзён, каб не трапіць у спісы плацельшчыкаў. Скажам, прыйшоў хлопец з войска 28 чэрвеня, на працу не змог уладкавацца і трапіў у спісы. А яго равеснік, які дэмабілізаваўся 1 ліпеня, па зразумелых прычынах у спісах не значыцца. Вось і такія нюансы павінны быць улічаны ў новай рэдакцыі, упэўнены на месцах.

У сваёй рабоце камісія пастаралася максімальна ўлічыць жыццёвыя акалічнасці кожнага грамадзяніна, расказаў **намеснік старшыні Драгічынскага райвыканкама Уладзімір НЕРАД.** За час яе работы да членаў камісіі звярнулася каля 70 чалавек. З іх прыкладна 80 працэнтаў было часткова альбо поўнасцю вызвалена ад выплаты збору. Уладзімір Івнавіч расказаў, што на камісію ішлі ў асноўным тыя людзі, у каго сапраўды склалася цяжкая жыццёвая сітуацыя, звязаная з хваробай блізкіх альбо немагчымасцю знайсці работу. Былі выпадкі, калі людзі звярталіся другі раз. Напрыклад, першы раз камісія не знайшла падстаў для станоўчага рашэння, а калі чалавек сабраў неабходныя дакументы і прадставіў іх, такое рашэнне было прынятае.

У любым раёне ўлічваюць той факт, што грамадзянін стараецца знайсці спосабы паляпшэння свайго дабрабыту нават у неспрыяльных жыццёвых абставінах. Пра гэта зайшла гаворка ў Рэчыцкім сельскім Савеце Камянецкага раёна. Яго **старшыня Наталля ШОСЦІК** таксама працавала з усімі грамадзянамі, якія атрымалі паведамленне аб зборы. Спачатку людзі ішлі ў сельскі Савет з просьбай аб вызваленні ад аплаты. Тут ім тлумачылі, што рашэнне прымае раённая камісія, давалі парады і неабходныя даведкі. Наталля Іванаўна расказала, што ў іх многія вяскоўцы за сезон зарабляюць добрыя грошы на зборы грыбоў і ягад. У іхняй лясной зоне так заведзена даўно. Дык вось цяпер яна раіць людзям пры здачы дароў лесу браць даведку ў нарыхтоўчай канторы аб колькасці здадзенага. Магчыма, гэта будзе ўлічана камісіямі ў далейшым.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

# ПРАЦАЎЛАДКАВАЦЬ УСІХ АХВОТНЫХ

## Такую мэту ставяць перад сабой улады Мастоўскага раёна

**У райвыканкаме адзначылі, што работа па Дэкрэце №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства» актывізавалася.**

— Літаральна за некалькі дзён праведзена пяць прыёмаў грамадзян, на якіх старшыня райвыканкама і яго намеснікі растлумачылі актуальныя пытанні па рэалізацыі дэкрэта, каб людзі ведалі, куды можна звярнуцца па той ці іншай праблеме. Падчас прыёму прадстаўнікі ўлады выслухалі і далі парады жыхарам раёна, якія звярнуліся з просьбай аб вызваленні ад уплаты збору па фінансаванні дзяржаўных расходаў, — паведаміла **намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама Марына ДАВЫДЗІК.**

Як яна паведаміла, днямі з работнікамі фанернага цэха ААТ «Мастоўдрэў» сустрэўся дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Валерый Саўко. Кіраўнік раённага аддзела Фонду сацыяльнай абароны Тамара Ісачанка расказала аб зваротным боку «зарплаты ў канвертах».

Спецыяльныя камісіі займаюцца пераглядам спісаў грамадзян, якія ўдзельнічаюць у фінансаванні дзяржаўных расходаў. Некаторыя жыхары раёна апынуліся ў цяжкім жыццёвым становішчы і не могуць заплаціць збор у памеры 360 рублёў. Частка такіх праблемных пытанняў вырашалася на працягу двух месяцаў. Большасці тых, хто звярнуўся з заявай аб вызваленні ад збору, пры наяўнасці неабходных дакументаў просьбу задаволілі.

— Перагляд спісаў патрэбны для таго, каб дасягнуць аб'ектыўнай ацэнкі становішча кожнага жыхара раёна, — растлумачыла Марына Давыдзік. — Магчыма, з гэтага спіса знікнуць тыя імёны, чые справы ўжо разгледжаны. Пасля дэталёвага аналізу спецыяльнай камісіяй спісы будуць скарэктаваны. Гэту работу трэба правесці да 1 красавіка.

Намаганні раённай вертыкалі ўлады накіраваны на тое, каб уладкаваць беспрацоўных, колькасць якіх з пачатку года крыху ўзрасла. Зараз ахвотных знайсці працу каля 200 чалавек. Гэта амаль на 70 чалавек больш, чым на пачатак года. А вось працоўных месцаў 119. Амаль палова вакансій — рабочыя прафесіі.

За мінулы год праз раённую службу занятасці знайшлі працу каля тысячы чалавек, у тым ліку амаль 120 беспрацоўных. Поўнасцю ўладкаваны асобы (а гэта 20 чалавек), якія абавязаны кампенсаваць дзяржаве расходы на ўтрыманне дзяцей. На перападрыхтоўку накіравана 50 беспрацоўных.

— Мы ставім сваёй галоўнай задачай працаўладкаваць усіх, хто жадае працаваць, — канстатуе Марына Давыдзік. — Вакансіі ў раёне ёсць, і яны не павінны пуставаць.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

# ЖАНЧЫНЫ МОГУЦЬ УСЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цёплыя словы падзякі і захаплення, падарункі, кветкі і святочнае выступленне ім дарылі мужчыны, паплечніцы і артысты. Усе яны адзначалі, што ролю жанчыны ў жыцці грамадства нельга не заўважыць і не ацаніць і што менавіта на жаночых плячах трымаецца праца ў многіх галінах і перш за ўсё у сям'і.



Фота БЕЛТА.

— Трэба звяртаць увагу на патэнцыял жанчын, на іх магчымасці і дапамагаць ім іх рэалізоўваць. На кожным прадпрыемстве неабходна ўкладаць інвестыцыі ў развіццё жаночага патэнцыялу, жаночага прафесіяналізму. Задача дзяржавы — стварыць умовы, каб жанчына магла рэалізоўваць свае прафесійныя і сямейныя якасці, — заўважыла **намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Марыяна ШЧОТКІНА, старшыня БСЖ.** — Колькі б ні было пачынанняў па актыўным далучэнні мужчын да выхавання дзяцей, аднак мы ўсе разумеем, што ўсё роўна поўнасцю жанчына ніколі не даверыць сваіх дзяцей нікому. Яна заўжды хоча быць побач, колькі б гадоў ім ні было. Таму трэба захоўваць для жанчын магчымасць рэалізоўваць сябе як маці і як спецыяліста.

Пра тое, што ў зале сабраліся выключна паспяховыя, годныя і творчыя жанчыны, пра адсутнасць у Беларусі гендарных праблем і прыгажосць суайчынніц казаў, віншуючы пераможцаў намінацыі «За лідарства і паспяховае кіраўніцтва», **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Валерый МАЦКЕВІЧ.**

Мноства цёплых слоў пачулі айчынныя прыгажуні і ад вядомых выканаўцаў, дзіцячых калектываў і студэнцкіх ансамбляў, якія прыйшлі павіншаваць пераможцаў песнямі і танцамі.

— Конкурс «Жанчына года» — гэта сапраўднае свята, і не толькі для жанчын, але і для нас, мужчын, бо мы ўсе захапляемся вамі, вашай прыгажосцю і працай, — зазначыў, узнагароджваючы найлепшых у намінацыі «За ўклад у развіццё духоўнасці і культуры», **намеснік міністра культуры Беларусі Васіль ЧЭРНІК.** Ён дадаў, што на плячах прыгажунь, якіх у сферы культуры працуе больш як 90%, ляжаць арганізацыя, рэжысура і падрыхтоўка ўсіх фестываляў, конкурсаў, канцэртаў.

Узнагароджваючы «Жанчын у навуцы», **старшыня вышэйшай атэстацыйнай камісіі Генадзь ПАЛЬЧЫК** прывёў невялікую статыстыку ў сваёй галіне.

— Прааналізаваўшы вынікі абароны дысертацый у розных галінах навукі за апошнія 10 гадоў, мы зразумелі, што і тут кантрольны пакет акцый у нашых дарагіх жанчын: 51,9% дысертантаў — вы. З 6174 дысертацый 3179 было абаронена прадстаўніцамі прыгожай паловы.

Прафесія дарыць цеплыню і святло — так ахарактарызавалі намінацыю «За выхаванне дзяцей і моладзі», пераможцаў якой віншаваў **Вадзім БОГУШ, першы намеснік міністра адукацыі.** Ён выказаў думку, што мужчыны нават не бяруцца канкурыраваць у той сферы, дзе жанчыны робяць сваю справу з самай лепшай якасцю — у місіі выхавання дзяцей.

«За ўклад у развіццё вёскі», яе адраджэнне, развіццё аграэкатурызму і мясцовага кіраўніцтва, за дбайную працу жанчынам-аграрыям дзякаваў **першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід МАРЫНІЧ.**

— Яшчэ сонца не ўзышло, а вы ўжо на нагах, сонца ўжо села, а вы яшчэ на нагах. І пры гэтым вы яшчэ знаходзіце час выхоўваць дзяцей. Гэта тытанічная праца, і я схіляюся перад вамі.

Уласна намінацыяй БСЖ назвала Марыяна Шчоткіна намінацыю «Паспяховы старт і надзея Беларускага саюза жанчын», віншуючы пераможцаў гэтай катэгорыі.

— Гэта наша намінацыя, і мы нікому не аддамо яе. Наша сіла ў адзінстве, у тым, што ў гэтай зале тыя, хто стаяў каля вытокаў нашай арганізацыі, і тыя, каму мы ўручым яе будучыню. І пакуль у нас ёсць шматпакаленнасць, салідарнасць, згуртаванасць, мы будзем апорай нашай краіны. Мы жанчыны, і мы можам усё.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

# Задачы для касмічнай дзяржавы

**Кластар па касмічнай галіне будзе створаны ў Беларусі. Пра гэта паведаміў старшыня Прэзідыума НАН Беларусі, кіраўнік Агенцтва па касмічных даследаваннях Акадэміі навук Уладзімір ГУСАКОЎ на нарадзе па пытаннях касмічнай дзейнасці.**

— У краіне трэба фарміраваць кластар на чале з Агенцтвам па касмічных даследаваннях, прадпрыемствам «Геаінфармацыйныя сістэмы» і Аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі Акадэміі навук. У яго павінны ўвайсці не толькі арганізацыі НАН Беларусі, але і прадпрыемствы, вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, дзе вядуцца даследаванні па гэтай тэматыцы, — БДУ, БДУІР і іншыя. А пляцоўкай для аб'яднання інтэлекту павінна стаць Нацыянальная акадэмія навук, — падкрэсліў Уладзімір Гусакоў.

На нарадзе былі разгледжаны мерапрыемствы Агенцтва па касмічных даследаваннях у 2017 годзе, заслухана інфармацыя аб стварэнні і развіцці шматузроўневай Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі з выкарыстаннем касмічных, авіяцыйных і наземных сродкаў дыстанцыйнага зандзіравання і тэхналогій іх прымянення.

Асаблівая ўвага была нададзена пытанням стварэння і запуску новага Беларускага касмічнага апарата (БКА), уключаючы неабходную мадэрнізацыю наземнай інфраструктуры. Як падкрэсліў у сваім выступленні на нарадзе **дырэктар УП «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі, галоўны канструктар Беларускай касмічнай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі Сяргей ЗАЛАТЫ,** «новы касмічны апарат, валодаючы ўнікальнымі магчымасцямі, будзе скіраваны на вырашэнне многіх задач у інтарэсах заказчыкаў як унутры краіны, так і за яе межамі».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Выстава

# КРОК У ДРУГОЕ СТАГОДДЗЕ

**У гомельскім палацы Румянцавых і Паскевічаў адкрылася выстава, прысвечаная стагоддзю газеты «Гомельская праўда». Цікава, што рэдакцыя выдання ў 1917 годзе знаходзілася менавіта ў гэтым раскошным былым княжым будынку.**

**У беларускай сталіцы адразу трое могілак можна аднесці да ліку агульнанацыянальных некропаляў — Кальварыйскія, Усходнія і Вайсковыя. Пра іх адметнасць, у межах адукацыйных лекцый, якія ладзяцца ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, расказаў гісторык, экскурсавод Павел Дзесюкоў.**

### КАЛЬВАРЫЯ

Самыя старыя могілкі ў Мінску, якія захаваліся да нашых дзён, — Кальварыйскія. Хаваць на Кальварыі пачалі яшчэ ў 1796 годзе. Аднак на сённяшні дзень самая старая магіла — сясцёр Юзэфы і Тэафіліі — 1808 і 1824 гадоў пахавання — іх помнік дайшоў да нашага часу. Адразу за ім можна ўбачыць яўрэйскую надмагільную пліту — мацэву.

Варта згадаць пра паходжанне гістарычнай назвы Кальварыя. Па-лацінску гэта тое ж, што па-грэчаску Галгофа — месца, дзе ўкрыжавалі Хрыста. Увогуле, этымалогія слова «кальварыя» — «лысы чэрап, лысая гара».

Могілкі часткова размяшчаюцца на зямлі Базыля Макаровіча, які нарадзіўся ў 1878 годзе. Таму ён пахаваны ў адной са сцен касцёла Узвіжэння Святога Крыжа, які стаіць тут.

Побач з касцёлам захавалася аўтэнтычная плітка XIX стагоддзя. Па ёй і сёння ходзяць людзі. А ў склепе, які знаходзіцца побач, па-ранейшаму ўстаўлены сапраўдныя металічныя дзверы.

Тут жа размяшчаюцца і два падземныя склепы. Адзін з іх цалкам засыпаны зямлёй, а другі толькі часткова.

### МАСТАКІ І НЕ ТОЛЬКІ...

Адна з адметных асоб, пахаваных на Кальварыі, — гэта мінскі мастак першай паловы XIX стагоддзя Ян Дамель. Ён завяшчаў быць пахаваным пад алтаром Кальварыйскага касцёла — так і адбылося.

Першую палову жыцця творца правёў у Вільні, выкладаў мастацтва. Аднак яго сябар вырашыў заняцца падробкай асігнацый, а паколькі абодва былі таленавітымі мастакамі, фальшывыя грошы яны ў прамым сэнсе малявалі. Іх махінацыі раскрылі, Яна Дамеля даставілі ў Мінск, дзе ён пэўны час знаходзіўся пад вартай. З тых часоў пачаў жыць і маляваць у цяперашняй беларускай сталіцы.

Арыгінальная карціна гэтага творцы і сёння захоўваецца ў доме-музеі Ваньковічаў, яна называецца «Павел І вызваляе Тадэвуша Касцюшку з турмы».

Цікавая гісторыя стварэння карціны «Святая Канстанцыя з крыжом», якая знаходзіцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея. Аднойчы Радзівілы заказалі ў Дамеля ікону Святой Канстанцыі — у той час акурат памерла Канстанцыя Чудорская. Заказчык акуратна паклаў партрэт побач з мастаком і сказаў: «А давай Святая Канстанцыя будзе крыху падобнай да гэтай Канстанцыі». Створаную ікону прынеслі ў касцёл, каб асвяціць. Аднак ксёндз катэгарычна адмовіўся зрабіць гэта. Так яна і засталася проста карцінай.

Яшчэ адзін арыгінал выпадкова знайшлі ў Вішневе, за алтаром. Там дзясяткі гадоў стаяла штосьці чорнае і незразумелае. А калі прадпрымальнік з Гомеля нарэшце ўзяўся прафінансаваць рэстаўрацыю і вядомую рэч пачысцілі ад бруду, высветлілася, што гэта работа Яна Дамеля — карціна «Святы Юзаф з дзіцяткам Езусам». Цяпер яна ўпрыгожвае галоўны алтар вішнеўскага касцёла.

Свой апошні спачын на Кальварыі знайшлі і іншыя слынныя мастакі. Напрыклад, Адам Шэвічус, пра якога згадвае ў сваіх нататках Уладзіслаў Сыракомля. Магіла не захавалася. Затое можна ўбачыць пахаванне Яўгена Куліка — творцы, які разам з мастаком Уладзімірам Крукоўскім распрацоўваў эталон першага беларускага герба.

### ПАЭТЫ І ІХ ПЛЯМЕННІКІ

У пачатку XX стагоддзя найлепшым доктарам у ваколіцах Мінска быў Зыгмунт Свяніцкі. Гэты чалавек першым здзейсніў пераліванне крыві, прывёз сюды рэнтгенаўскі апарат. Ён бясплатна лячыў бедных — у тых самых старых карпусах 2-й бальніцы ля Траецкага прадмесця.

У канцы XIX стагоддзя Свяніцкі сватаўся да Элізы Ажэшкі, з якой меў раман. Аднак штосьці не склалася, і Ажэшка засталася ў Гродне, доктар вярнуўся ў Мінск і пабудаваў дом. Варта дадаць, што сын доктара распачаў работу першага ў сталіцы таксі — у 1913 годзе тут з'явіўся таксаматор №1.

Цікава, як па-асабліваму Свяніцкага цягнула да літаратуры. Калі прыглядзецца да помніка, пад якім ён пахаваны, то можна ўбачыць, што разам з ім ляжыць Марыя з роду... Міцкевічаў. Такім чынам, на Кальварыі пахавана яшчэ і пляменніца нашага паэта Адама Міцкевіча.

На Кальварыі пахаваны Аляксей Сіпаеў — святар, які калісьці ўзначальваў кафедральны касцёл. Памёр ён вельмі рана, у 32 гады.

Ёсць тут і магіла Клацільды Вайніловіч — прыёркі кляштара бенедыктынак. Яна з тых самых Вайніловічаў, Эдвард з якіх праз паўстагоддзя пабудуе новы касцёл. Клацільда ж 32 гады ўзначальвала жаночы кляштар, які калісьці стаяў на месцы кінатэатра «Перамога». На сённяшні дзень ад яго засталіся толькі падмуркі...

Знайшоў тут свой апошні спачын і беларускі паэт-дэмакрат Янка Лучына. Самым важным яго ўчынкам з'яўляецца тое, што праз 25 гадоў пасля паўстання Каліноўскага ў газеце «Минский листок» ён змог апублікаваць верш на беларускай мове, які называўся «Вясновай парой». Да гэтага нічога на роднай мове не друкавалі ўжо чвэрць стагоддзя.



Пахаванне сясцёр Рудольфа ПІШЧАЛЫ на Кальварыі.

У 1903 годзе, ужо пасмяротна, выйшла першая кніга Янкі Лучыны «Вязанка». Але ж да 1905 года друкаваць па-беларуску было забаронена. Браты Луцкевічы вазілі гэту кнігу для адабрэння цэнзарамі ў Пецярбург і там прадставілі яе як кнігу на балгарскай мове. Цэнзары не разабраліся, на якой мове насамрэч напісана кніга, і толькі дзякуючы гэтаму яна пабачыла свет.

На могілках ёсць свой прывід — белая панна Кальварыі. Ходзіць легенда, што ў склепе ў XIX стагоддзі была пахавана паненка, якая насамрэч не памерла, а заснула летаргічным сном. З тых часоў па могілках блукае яе прывід.

Кальварыя зазнала некалькі хваляў руйнавання. Самая сур'ёзная была ў 1997 годзе, калі знеслі палову могілак, бо патрэбна было месца для камерцыйных пахаванняў. Старыя пліты проста выкідалі на сметнік.

Многія крыжы калісьці былі спілаваныя і здадзены на металалом.

У 1999 годзе здарылася трагедыя на Нямізе. Тады сярод іншых загінула дачка славутага скульптара Міхася Інькова. Ён адліў выяву дачкі Марыі, а таксама велічны мемарыял усім загінулым.

Апошні народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, які нядаўна памёр, таксама пахаваны на Кальварыі, бо там яго чакала жонка. Магілу паэта можна знайсці, калі, стоячы злева ад касцёла (гледзячы ад уваходу), да ўпору ісці па сцяжыне — яна і прывядзе да пахавання.

### ВАЙСКОВЫЯ МОГІЛКІ

Вайсковыя могілкі — другія па старажытнасці, пачалі дзейнічаць яшчэ з 1896 года.

На іх пахавана вельмі шмат славутых беларусаў — Усевалад Ігнатоўскі, Янка Купала, Якуб Колас, Паўлюк Трус, Кузьма Чорны, Аляксандр Чарвякоў.

Гэтыя могілкі планавалі зрабіць агульнанацыянальным некропалем. Але яны досыць невялікія, таму з часам пахаванні на іх спынілі. Цяпер вядомых беларусаў хаваюць на Усходніх могілках.

У цэнтры тэрыторыі размяшчаецца царква Аляксандра Неўскага, у якой пахаваны салдаты руска-турэцкай вайны. Захоўваецца ў будынку і ўнікальны артэфакт — драўляная пераносная царква, якую вайскоўцы бралі з сабой у паход. Яе можна ўбачыць злева ад царскай брамы.

### УСХОДНІЯ МОГІЛКІ

Усходнія могілкі ў пэўным сэнсе самыя загадкавыя. Яны з'яўляюцца «працягам» Вайсковых могілак. З 1956 года там пачалі хаваць славутых асоб. Тут знайшлі спачын Кандрат Крапіва, Яўгенія Янішчыц, Уладзімір Мулявін, Іван Шамякін, Стэфанія Станюта, Пімен Панчанка, Васіль Быкаў. Каб у адным месцы было пахавана так шмат пісьменнікаў, журналістаў, паэтаў — гэта сапраўды знакава.



На Усходніх могілках можна ўбачыць арыгінальны помнік кампазітару Іосіфу ЖЫНОВІЧУ.

З апошніх пахаванняў — Генадзь Бураўкін, Аляксандр Ціхановіч.

Мала хто ведае, што насупраць могілак, у лесе, у часы Вялікай Айчыннай вайны хавалі забітых нямецкіх вайскоўцаў. Пасля вайны ўсе памятныя знакі былі знесены. Толькі ў нядаўнія часы пачалі праводзіцца перазахаванні.

«Калі прыходзіш на могілкі, адразу апаноўвае пэўны смутак, — заўважае Павел Дзесюкоў. — Аднак для заходніх людзей могілкі — гэта месца памяці. І месца адукацыі, бо тамтэйшых школьнікаў прыводзяць на вялікія некрапалі, дзе расказваюць, хто там пахаваны і што вартага зрабілі гэтыя людзі. З красавіка і ў нас аднаўляюцца экскурсіі па сталічных некропалях. Кожную суботу і нядзелю ў 11 раніцы па чарзе будзем наведваць Кальварыю, Вайсковыя і Усходнія могілкі. Запрашаю ўсіх ахвотных далучацца».

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*

---

Пантэон Айчыны

# ВОЙШАЛК

*Войшалк, у адрозненне ад Міндоўга, дзейнічаў не грубымі сіламі, не аблудліва. Ён да патрэбнага часу хаваў свае намеры, без шуму плёў інтрыгі, пускаўся на хітрасці, ішоў на кампрамісы. Менавіта Войшалку выпала місія стаць заснавальнікам адной з найбуйнейшых еўрапейскіх сярэдневяковых дзяржаў — Вялікага Княства Літоўскага.*

Летапіс называе Войшалка наваградскім князем. Магчыма, Міндоўг пасля паражэння ад Данілы Галіцкага перадаў Навагрудак свайму сыну, а можа быць, і самі навагрудцы выбралі яго. Адбылося гэта прыкладна ў 1254 годзе. Звернем увагу на летапіснае паведамленне, што Войшалк «в поганьстве буды». Не выключана, што Міндоўг з'явіўся ў Навагрудку па запрашэнні паганцаў.

Калі ўлічыць, што хрысціянства ў Верхнім Панямонні не мела трывалага становішча і болей чым праз сто гадоў Навагрудак адышоў ад хрысціянства, пра што пісаў у 1378 годзе кіеўскі мітрапаліт Кіпрыян, дык у часы Міндоўга паганцы ў Навагрудку пасля смерці хрысціянскага князя маглі запрасіць да сябе паганскага князя. Відаць, Войшалк распраўіўся са сваімі праціўнікамі: «... нача проливати крови много». Аднак з палітычных мэт, каб заключыць мір з Данілам Галіцкім, ён прыняў праваслаўе. Мір Войшалк устанавіў, але вымушаны быў адмовіцца ад Навагрудка і навагрудскага пасада. Войшалк павінен быў жыць пры двары Данілы як заложнік. Каб пазбавіцца ад «ганаровага палону», ён прымае манаства. Даніла паверыў, што былы навагрудскі князь выракся палітычнага жыцця, і дазволіў яму заснаваць каля Навагрудка манастыр на мяжы Навагрудскай зямлі і Літвы (цяпер тут вёска Лаўрышава Навагрудскага раёна). З-за манастырскіх сцен князь-манах рыхтаваў паўстанне супраць галіцка-валынскіх захопнікаў. Ён знайшоў і саюзніка — полацкага князя Таўцівіла.

У 1258 годзе Войшалк скідае маску багалюбівага манаха. З Полацка прыбывае дружына на чале з князем Таўцівілам. Войшалк з дапамогай палачан і сваіх прыхільнікаў авалодаў Навагрудкам і зноў сеў на княжацкі пасад. Раз'юшаны Даніла Галіцкі асабіста павёў войска на Навагрудскае княства. Але Войшалк і Таўцівіл не ўступілі ў бой, умела манеўравалі і выйгралі час, дачакаліся прыходу татара-мангольскай раці Бурундая. На загадзе Бурундая Даніла вымушаны быў пасласць войска на Літву і Нальшчаны. Такім чынам Войшалк аднавіў незалежнасць Навагрудскай зямлі і цяпер выношваў задуму далучыць да яе Літву.

Пасля смерці Міндоўга ў 1263 годзе «во всей земле Литовской и Жемойтской» правіў жамойцкі князь Транята. Запрасіўшы да сябе полацкага князя Таўцівіла дзяліць «землю и добыток Миндовгов», ён забіў яго, а полацкіх баяр зняволіў. Абяцаючы вызваліць баяр, Транята навязаў Полацку свайго стаўленіка. Цяпер, калі Полацк выйшаў з барацьбы, Транята мог распраўіцца і з Войшалкам. Аднак Войшалк аказаўся хітрэйшым. Ён пакінуў Навагрудак і адправіўся ў Пінск збіраць войска. І не без Войшалкавай падтрымкі сярод літоўскай знаці ўзнікла змова супраць Траняты.

Як толькі змоўшчыкі забілі Траняту, Войшалк з пінскай дружынай выступіў у Навагрудак, дзе яго чакала навагрудская дружына. З пінянамі і навагрудцамі Войшалк заняў Літву. Былы манах, забыўшыся пра хрысціянскую літасць, з жорсткасцю «вороги свои убивати, изби их бесчисленное множество, а друзии разбегошося камо кто видя».

Расправіўшыся з унутранымі ворагамі, Войшалк заключыў мір з Ордэнам і Галіцка-Валынскім княствам. Каб атрымаць вайсковую сілу, Войшалк прызнае сябе васалам берасцейскага князя Васількі Раманавіча і запрашае яго сына Шварна «помагати» ўладарыць. Васілька і Шварн прыслалі Войшалку сваё дружыны. У 1264 годзе Войшалк заваяваў Дзяволтву (зямля, якая знаходзілася ў раёне горада Вількаміра) і Нальшчаны, далучыў іх да Навагрудка. Уладу Войшалка прызнаў і Полацк.

Аб'яднанне вакол Навагрудка Пінскай, Літоўскай, Дзяволтаўскай, Нальшчанскай

■ Полацкі сшытак

# Традыцыі неперарваная стужка...




Самы старажытны свяшчэнны тэкст, які мае беларускае паходжанне, — гэта Полацкае евангелле XII—XIII стст. Аднак пільнай увагі даследчыкаў заслугоўваюць і іншыя, больш познія кнігі, таксама евангельскага зместу. Яны маюць дачыненне да гістарычнай Полаччыны, а сёння геаграфія іх знаходжання вельмі шырокая — ад Новасібірска да Кіева.

У першую чаргу гаворка пойдзе пра Аршанскае евангелле XIII ст. Рукапіс знік з аршанскай царквы ў час Напалеонаўскай вайны (французскія салдаты выкінулі кнігу проста на снег, перад гэтым здзёршы дарагі сярэбраны аклад). У цяперашні час помнік захоўваецца ў Кіеве ў бібліятэцы Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Рукапіс моцна пашкоджаны, страчана большая частка, да нас дайшло толькі 142 аркушы без пачатку і канца. Храналогія евангельскіх чытанняў дазваляе вызначыць тып Евангелля — поўны апракас, г. зн. у першапачатковым выглядзе кніга змяшчала ўсе неабходныя службовыя тэксты, размешчаныя ў каляндарным парадку па днях года для чытання ў царкве з верасня па чэрвень. У Аршанскім евангеллі ёсць дзве мініяцюры з выявай евангелістаў Лукі і Матфея, дзве застаўкі і 310 ініцыяляў (загалоўных літар), выкананых спецыяльнай чырвонай фарбай. Даследчыкі адзначаюць падабенства мініяцюр Аршанскага евангелля да фрэсак Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра ў Полацку. Евангельскі тэкст напісаны на пергаменце ў два слупкі ўставам у дзве калонкі. Нетыповым для кніжнага ілюстрацыйнага мастацтва таго часу з'яўляецца выкарыстанне тэтралагічных матываў у афармленні ініцыяляў, гэта значыць выяў птушак і звяроў.

Мова помніка царкоўнаславянская, з невялічкімі ўкрапленнямі беларусізмаў, напрыклад выпадкамі акання: *съгараюць, утапати, затваряете*. Асабліва важнай для вызначэння месца напісання помніка з'яўляецца такая фанетычная з'ява, як цоканне (калі ў дыялекце два гукі *ц* і *ч* супадаюць у адным гуку *ц*). Гэтая рыса калісьці была яскравай прыкметай дыялекту старажытных крывічоў — племені, якое рассялілася па велізарных тэрыторыях паўночна-ўсходняй Славіі і ў старажытнасці фіксавалася і ў ваколіцах Полацка — цэнтра крывіцкай культуры. Так, у Дагаворнай грамаце смаленскага князя Мсціслава Давыдавіча з Рыгай і Гоцкім берагам за 1229 год мы чытаем *на Гочъкомъ березе*, у грамаце рыжан да віцебскага князя Міхаіла Канстанцінавіча, каля 1300 года: *мець вызети ли ся силою, забылъ... своего крестнаго челования, есть миръ доконцянъ і інш.*, у дагаворы Полацка з Рыгай, 1407 г., таксама адзначаецца *у полочку*. Пісец не быў упэўнены, якую літару менавіта трэба пісаць на месцы *ц* і таму часта блытаў, замест *ц* пісаў *ч* і наадварот. Аналагічныя прыклады можна прывесці і з Аршанскага евангелля: *отсеци* (замест *отсечи*), *оцещающе* (замест *очещающе*), праўда, такіх выпадкаў нашмат менш, чым адзначана ў Полацкім евангеллі канца XII ст. У рукапісе таксама адзначаны выпадкі зацвярдзення шыпячых і *ц*.


Старонка з Аршанскага евангелля XIII ст.

Прыналежнасць да полацкай літаратурна-пісьмовай традыцыі даказваюць і моўныя асаблівасці Друцкага евангелля XIV ст., напісанага ўставам у два слупкі. Рукапіс уяўляе сабой поўны апракас. Тэкст дайшоў да нашых дзён практычна ў першасным выглядзе, адсутнічае толькі адзін сшытак. Пасля евангельскіх чытанняў у кнізе ёсць прыпіска дзелавога характару, у якой адзначаецца дата пабудовы царквы святой Багародзіцы ў Друцку — 1001 г., але некаторымі даследчыкамі сёння яна ставіцца пад сумненне. Нягледзячы на гэта, можна сцвярджаць, што традыцыя пісьма ў Друцку як цэнтры княства мае глыбокія карані, паколькі падчас археалагічных раскопак былі знойдзены фрагменты фундамента і некаторыя прадметы царкоўнага абсталявання, у тым ліку і пісалы, яшчэ ў слаях глебы XII ст. Арыгінал помніка захоўваецца ў Новасібірску.

Моўныя асаблівасці Друцкага евангелля блізкія да ўжо разгледжаных папярэдне. Непаслядоўна, але ў значнай ступені ў гэтым помніку пісьменнасці адлюстравана зацвярдзенне шыпячых, там мы знаходзім *чадомъ* (замест *чядомъ*), *разумеша* (замест *разумешя*), *ища* (замест *ищя*). У Друцкім евангеллі, як ні ў адным іншым старажытным тэксце, адзначана такая з'ява, як вакалізацыя паўгалосных (гэта значыць пераўтварэнне паўгалосных у гукі поўнага ўтварэння і адлюстраванне гэтага на пісьме). Відавочна, што гэта не было сведчаннем звышвакальнай якасці мовы пісца, проста такое напісанне спрыяла распеўнаму вымаўленню евангельскага тэксту ў царкве падчас богаслужэння: *возва* (замест *възва*), *во имя его* (замест *въ имя его*), *во истину* (замест *въ истину*), *во въскрешеньи* (замест *въ въскрешеньи*) і пад. У шырокім маштабе ў тэксце Друцкага евангелля фіксуецца такая з'ява, як цоканне, пра якую гаворка была вышэй: *сынъ человець* (замест *сынъ человечь*), *наричаемого* (замест *нарицаемого*), *оце* (замест *отче*). На чытанне ў суботу ў 17-ы тыдзень пасля Тройцы замест *мудрымъ* мы чытаем *мыдрымъ*. На першы погляд, гэта звычайная апіска. Як бы мы сказалі сёння, памылка друку. Але калі звярнуцца да дыялекталагічных атласаў, то можна ўбачыць, што на тэрыторыі Магілёўшчыны фіксуецца з'ява пераходу *ы (і)* у *у*: замест *мыло* там скажуць *муло*, замест *былі — булі*, менавіта адлюстраванне такога вымаўлення трапіла на старонкі старажытнага тэксту.

У Расійскай нацыянальнай бібліятэцы захоўваюцца і больш познія рукапісы XVI ст., прыналежнасць якіх да Полацка не аспрэчваецца амаль нікім. Гэта евангельскія тэксты для манастырскага карыстання, пісаныя паўуставам на паперы. Паколькі гэтыя кнігі не мелі строга акрэсленага літургічнага прызначэння, беларускіх моўных асаблівасцяў у іх яшчэ больш. Гэта і праявы акання *(разаряше, араматы)*, і адлюстраванне зацвярдзення шыпячых, *р* і *ц (близнець, корябля)*, і ўжо згаданае вышэй цоканне *(наречается, человецскыи, биць* — замест *бичь*), пераход *о* ў *у* (*суседи*).

Сабраныя па крупіцах звесткі пра старажытныя евангельскія тэксты, прыналежныя да полацкіх зямель, натуральна, не з'яўляюцца вычарпальнымі. Полаччына шмат разоў была эпіцэнтрам важных гістарычных падзей, у выніку якіх знішчаліся гістарычныя каштоўнасці, матэрыяльныя і духоўныя. На сённяшні дзень нашай задачай мы бачым актыўны ўдзел у вяртанні страчанай духоўнай спадчыны на нашу Радзіму: у пошуку і выданні старажытных рукапісаў і кнігадрукаў, вывучэнні іх, перакладзе на сучасную беларускую мову і папулярызацыі старажытных тэкстаў сакральнага зместу, што, на нашу думку, мае і навуковае, і выхаваўчае значэнне для будучых пакаленняў беларусаў.

**Ірына БУДЗЬКО**

# (? — 1268)

...і Полацкай зямель і з'явілася пачаткам новай дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага і Рускага.

Пасля заваёвы балцкіх зямель Войшалк задумаў хрысціць іх. Як пішаНіканаўскі летапіс, Войшалк «...многих крести, и церкви и монастыри воздвиже». Аднак гэтую справу ён не завяршыў. Па невядомых прычынах Войшалк пакінуў наваградскі пасад і зноў прыняў манаскі сан. Іпацьеўскі летапіс трактуе гэты крок як духоўны ўчынак князя, раскаянне за кровапраліцце. «Согрешил есмь много перед Богом и человеки». Вялікім князем стаў Шварн Васількавіч, а Войшалк пайшоў у манастыр. Можна дапусціць, што пад прыкрыццём манаскай расы ён хацеў набраць манахаў для хрышчэння Літвы.

Трагічна завяршылася жыццё Войшалка. Уладзімірскі князь Леў Данілавіч, угневаны на Войшалка за тое, што «дал землю Литовскую брату его Шварнови», забіў яго ў манастыры.

Іншую версію забойства Войшалка падае «Хроніка Літоўская і Жамойцкая». Паводле яе, пасля смерці Данілы Галіцкага ягоныя сыны мячом пачалі дзяліць бацькаўскую спадчыну. Князь Леў Данілавіч захапіў Шварнаў удзел — Драгічынскую зямлю. Шварн звярнуўся па дапамогу да Войшалка. Вялікі князь на чале войска заняў Драгічынскую і Берасцейскую землі і рушыў на сталіцу Валыні Уладзімір.

Леў Данілавіч запрасіў Войшалка на перагаворы. Шварн і Васілька «верою своею» абяцалі Войшалку «безпеченство». Войшалк паверыў іх клятве, спыніў войска і прыехаў ва Уладзімір. У манастыр, дзе спыніўся Войшалк, прыехаў Леў Данілавіч і, напіўшыся, рассек шабляй Войшалку галаву. У тую ж ноч «гасцінныя» гаспадары пасеклі і парэзалі ўсіх Войшалкавых паслоў. І гэта версія здаецца больш праўдзівай за версію Іпацьеўскага летапісу.



Смерць Войшалка ўжо нічога не вырашала. Закладзены ім падмурак быў трывалы. На ім пабудавалі Войшалкавы наступнікі адну з найбуйнейшых ў Еўропе дзяржаў, якая стала на многія стагоддзі агульным домам для беларусаў, летувісаў і ўкраінцаў.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

■ Практычнае радзімазнаўства

# ВЯРТАННЕ ГЕЛЕНЫ СКІРМУНТ

**У Пінскім музеі беларускага Палесся паспяхова працуе выстаўка ўраджэнкі вёскі Калоднае слыннай мастачкі і першай беларускай разьбяркі Гелены Скірмунт, прысвечаная 190-годдзю са дня яе нараджэння, што будзе адзначацца сёлета 5 лістапада.**

У экспазіцыі пад назвай «Творчая мазаіка Гелены Скірмунт» упершыню ў наш час прадстаўлены ўнікальны альбом фотаработ славутай паляшучкі — самы поўны з трох, што ёсць у свеце. Побач са здымкамі Гелены дэманструюцца і 14 арыгінальных літаграфій яе настаўніка і роднага дзядзькі Напалеона Орды, сусветна вядомага мастака, скульптара, літаратара і кампазітара, якога лічаць сваім і беларусы, і палякі, і літоўцы.

Нарадзілася Гелена ў тагачасным Пінскім павеце, у маёнтку Калоднае, уладальнікам якога быў яе бацька — прадстаўнік моцнага магнацкага польскага рода Аляксандр Скірмунт. Маці таксама паходзіла з вядомага рода Ордаў і даводзілася сястрой Напалеону Ордзе.

Ужо ў дзяцінстве дзяўчынка зацікавілася мастацтвам, з задавальненнем малявала родную прыроду. Бацькі заўважылі і падтрымалі яе захапленне, і з іхняй згоды яна паехала вучыцца ў Вільню. Значны ўплыў на яе творчасць, як ужо адзначалася, аказаў Напалеон Орда, што часта прыязджаў у Пінск, а адтуль — да сястры ў Калоднае, якое знаходзіцца ад Пінска ўсяго за 36 кіламетраў.

Атрымаўшы патрэбныя веды, Гелена вярнулася ў родны маёнтак, пабралася шлюбам з архітэктарам Казімірам Скірмунтам, пачала стала займацца мастацтвам. Рабіла замалёўкі прыгожых мясцін, ляпіла скульптуры з гліны, выразала з дрэва медальёны з выявамі сваякоў і славутых людзей. Адначасова актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці гміны, адчыніла дзве школы для сялянскіх дзяцей. Шчыра вітала адмену прыгоннага права і ў гонар гэтай падзеі нават устанавіла крыж у суседняй вёсцы Радчыцк.


Фота Сцяпана ГАРЫНЦА.
Дакрануцца да творчасці славутай зямлячкі.

Скірмунты з сімпатыяй успрынялі паўстанне пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, і, калі праз палескія вёскі ў бок Валыні рухаўся атрад пад камандаваннем Рамуальда Траўгута, Гелена ўзялася перадаць паўстанцам ліст з важнымі звесткамі. Аднак па дарозе была затрымана расійскімі салдатамі і адпраўлена на допыт у Пінск. Даказаць яе віну ў падтрымцы паўстання следчым не ўдалося, але жанчыну, у якой на той час было ўжо трое дзяцей, саслалі ў Тамбоў.

Ссылка моцна падарвала яе здароўе, і Гелена была вымушана паехаць на лячэнне за мяжу, дзе 1 лютага 1874 года яе не стала. Пахавана наша слынная зямлячка на могілках па вул. Спакойнай у Пінску. І можна казаць, што выстаўка твораў — гэта своеасаблівае наведванне мастачкай родных мясцін.

Не забыліся пра «Алену» — так яе называюць у Калодным — і непасрэдна на малой радзіме. У 2003-м, праз 129 гадоў пасля яе смерці, тут з'явілася мемарыяльная пліта з надпісам: «У памяць знакамітай мастачкі Гелены Скірмунт (1827—1874), ураджэнкі вёскі Калоднае, устаноўлена на месцы сядзібы Скірмунтаў».

Значнай цікавасцю ў аматараў і спецыялістаў карыстаюцца таксама дзённікавыя запісы Гелены Скірмунт, якія леглі ў аснову кнігі Б. Залескага, выдадзенай у 1876 г. на польскай мове. У 2009 годзе — з той жа назвай, але ўжо на мове беларускай — яна ўбачыла свет у мінскім выдавецтве Віктара Хурсіка.

**Міхась КАРСЕКА**

## ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» за 2016 год

Адрес: 220007, г. Минск, ул. Володько, 20 УНП 100036332

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2016 года** (тыс. руб.)

| АКТИВЫ | Код стр. | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| **1. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства: первоначальная стоимость | 110 | 1 400 | 961 |
| Нематериальные активы: первоначальная стоимость | 120 | 1 | - |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | 521 | 271 |
| **ИТОГО по разделу 1** | **190** | **1 922** | **1 232** |
| **2. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы | 210 | 7 | 9 |
| В том числе: материалы | 211 | 7 | 9 |
| Расходы будущих периодов | 230 | - | 73 |
| Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам | 240 | 35 | - |
| Краткосрочная дебиторская задолженность | 250 | 114 | 114 |
| Денежные средства и их эквиваленты | 270 | 22 | 51 |
| **ИТОГО по разделу 2** | **290** | **178** | **247** |
| **БАЛАНС** | **300** | **2 100** | **1 479** |
| **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| **3. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 18 | 14 |
| Добавочный капитал | 450 | 765 | 760 |
| Нераспределенная прибыль | 460 | (756) | (51) |
| **ИТОГО по разделу 3** | **490** | **27** | **723** |
| **4. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | 2 036 | 723 |
| **ИТОГО по разделу 4** | **590** | **2 036** | **723** |
| **5. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Краткосрочная кредиторская задолженность | 630 | 37 | 33 |
| В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям | 631 | 27 | 2 |
| по авансам полученным | 632 | 3 | - |
| по налогам и сборам | 633 | - | 4 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 634 | 1 | 3 |
| по оплате труда | 635 | 6 | 7 |
| прочим кредиторам | 638 | - | 17 |
| **ИТОГО по разделу 5** | **690** | **37** | **33** |
| **БАЛАНС** | **700** | **2 100** | **1 479** |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь – декабрь 2016** (тыс. руб.)

| НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ | Код. стр. | На 31 декабря 2016 года | На 31 декабря 2015 года |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 285 | 458 |
| Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг | 020 | 230 | 297 |
| Валовая прибыль | 030 | 55 | 161 |
| Управленческие расходы | 040 | 117 | 96 |
| Расходы на реализацию | 050 | - | 18 |
| Прибыль (убыток) от реализации продукции товаров, работ, услуг | 060 | (62) | 47 |
| Прочие доходы от текущей деятельности | 070 | 10 | 2 |
| Прочие расходы от текущей деятельности | 080 | 19 | 20 |
| Прибыль (убыток) от текущей деятельности | 090 | (71) | 29 |
| Доходы от инвестиционной деятельности | 100 | - | 3 |
| В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 101 | - | 3 |
| Доходы по финансовой деятельности | 120 | - | 2 |
| Расходы по финансовой деятельности | 130 | 655 | 58 |
| В том числе: проценты к уплате | 131 | 196 | 37 |
| прочие расходы по финансовой деятельности | 133 | 459 | 21 |
| Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности | 140 | (655) | (53) |
| Прибыль (убыток) до налогообложения | 150 | (726) | (24) |
| Налог на прибыль | 160 | - | (2) |
| Чистая прибыль (убыток) | 210 | (726) | (26) |
| Совокупная прибыль (убыток) | 240 | (726) | (26) |
| Базовая прибыль (убыток) на одну акцию, рублей | 250 | (0,0061) | 288 |
| Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей | 260 | (0,0061) | (288) |

Данные отчетности подтверждены аудиторской проверкой.

**Информация об ОАО и его деятельности по состоянию на 1 января 2017 года:**

– количество акционеров всего: 555, в том числе: юридические лица – 1, физические лица – 554;
– доля государства в уставном фонде ОАО – нет;
– фактически выплаченные дивиденды - нет;
– дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги), – нет;
– обеспеченность акции имуществом общества – 0,23 руб.;
– акции, находящиеся на балансе общества, – нет;
– выручка от реализации товаров, работ, услуг – 285 тыс. руб.;
– долгосрочная дебиторская задолженность – нет;
– долгосрочные обязательства – 2 036 тыс. руб.;
– среднесписочная численность работающих – 18 чел.;
– основные виды деятельности, по которым получено 20% и более выручки: сдача в наем недвижимого имущества.

Правила корпоративного поведения применяются.

Годовое общее собрание акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский баланс за 2016 год, состоялось 14.03.2017.

Сайт общества в сети Интернет – нет.

Управляющий А.Н. Хвесюкович

## ОБЪЯВЛЕНИЕ о торгах

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | Лот №1. Изолированное помещение (квартира) инв. №240/D-40589, наименование – 3-комнатная квартира, общей площадью 77,8 кв. м.<br>Первоначальная стоимость – 79 400 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Долевая собственность. 5/8 – Козаченко С.И., 1/8 – Козаченко П.С., 1/8 – Козаченко И.С., 1/8 – Козаченко Д.С. |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | г. Орша, пр. Текстильщиков, 21-33 |
| **Информация об обременениях** | Без обременений |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | г. Орша, ул. Островского, 36, каб. 5<br>18 апреля 2017 года в 11.00 |
| **Справочная информация** | Отдел принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши, 211030, г .Орша, ул. Островского, 36<br>Судебный исполнитель – Юденкова Екатерина Сергеевна, тел.: 80216543215, 80333998327.<br>Начальник отдела – Павлюченкова Наталья Евгеньевна, тел. 80216543213 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Оршанского района и г. Орши №3642903000794 ОАО «АСБ «Беларусбанк», код 647, УНП 30002505, не позднее 17.04.2017 г., 10.00.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

по продаже права заключения договоров аренды недвижимого имущества

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

| |
|---|
| **Продавец:** Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», Витебский филиал, г. Витебск, пр-т Московский, 10, тел. (0212) 61-66-90 |
| Лот №1. Право на заключение договора аренды сроком на 5 лет помещения площадью 35,94 кв. м, расположенного на 1-м этаже капитального строения с инв. №240/С-18515 по адресу: Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 46 (здание специализированное связи) для размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, организации производства (кроме вредных производств). Размер коэффициента к базовой ставке арендной платы равен 3. **Начальная цена**: 8,99 базовых арендных величин. **Задаток:** 0,9 базовых арендных величин |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 21.04.2017 в 15.00 по адресу: г. Орша, ул. Ленина, 46, здание РУПС. **Срок внесения задатка и подачи документов:** с 21.03.2017 с 8.30 по 20.04.2017 до 17.30 |

**Заявления на участие в аукционах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни, с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08 2009 №1049. Юридические, физические лица, индивидуальные предприниматели обязаны подать организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы, предоставить: копию платежного документа о перечислении задатка на расчетный счет организатора аукциона; юр. лицом – резидентом РБ: копию документа, подтверждающую гос. регистрацию юр. лица; юр. лицом – нерезидентом РБ: легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; индивидуальным предпринимателем: копию документа, подтверждающего гос. регистрацию индивидуального предпринимателя. При подаче заявления на участие в аукционе предъявляется документ, удостоверяющий личность; представителями – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица). Победитель аукциона – лицо, предложившее самую высокую цену. Победитель аукциона (лицо, приравненное к Победителю аукциона) обязан оплатить предмет аукциона, затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона; заключить договор аренды недвижимого имущества не позднее 10 рабочих дней со дня проведения аукциона. В случаях, если Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) не подписал протокол аукциона, не уплатил сумму, по которой продан предмет аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор аренды, а также в случае если участники аукциона отказались объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным, указанными лицами уплачивается штраф в размере 100 базовых величин. Сумма задатка перечисляется на р/с организатора аукциона: №3012078870010 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК 153001117, УНП 390477566. Конт. тел. (0212) 42-61-62, e-mail: vcm74@mail.ru, www.marketvit.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ

**19 апреля 2017 года** повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «НПО Центр»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе, инв. номер в ЕГРНИ)** | «Производственный корпус №1» общей площадью 3523 кв. м, инв. номер: 611/С-2660;<br>«Производственное здание» общей площадью 3861,1 кв. м, инв. номер 611/С-9297;<br>«Испытательная станция» общей площадью 440,9 кв. м, инв. номер: 611/С-10364;<br>«Подстанция КТП» общей площадью 40 кв.м, инв. номер: 611/С-10368;<br>«Хозпостройка» общей площадью 376,9 кв. м, инв. номер: 611/С-2659;<br>«Открытый металлический навес с испытательными боксами» общей площадью 549,1 кв. м, инв. номер: 611/С-30483;<br>«Сети хозяйственно-питьевого и противопожарного водопровода», инв. номер: 611/С-31529;<br>«Сети тепловые», инв. номер: 611/С-31527;<br>«Канализационные сети», инв. номер: 611/С-31528;<br>«Сооружения очистные V=250 м$^3$», инв. номер: 611/С-31526;<br>«Сети слаботочные внутриплощадочные», инв. номер: 611/С-33332 |
| **Сведения о земельном участке** | Площадь – 4,7852 га;<br>кадастровый номер – 620450100001000588 |
| **Местонахождение** | Минская обл., Березинский р-н, г. Березино,<br>ул. Марии Романович, д. 21 |
| **Продавец имущества** | ОАО «НПО Центр»,<br>220018, г. Минск, ул. Шаранговича, 19, ком. 304 |
| **Организатор торгов** | Государственное предприятие «МГЦН»,<br>220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10 |
| **Начальная цена предмета торгов (без учета НДС)** | 1 341 750,00 бел. руб. |
| **Сумма задатка** | 100 000,00 бел. руб. |
| **Условие торгов (условие продажи)** | Победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов |

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «НПО Центр», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся 19 апреля 2017 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 21.03.2017 по 17.04.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017)259-05-54, (029) 686-45-13 (ОАО «НПО Центр»)

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» по поручению Минского районного исполнительного комитета проводит открытый аукцион по продаже **единого предмета аукциона** в составе:

**право заключения договора аренды земельного участка для строительства и организации деятельности гостиничного комплекса** с кадастровым номером 623680604601000731 площадью **1,1600 га**, расположенного по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, **д. Королев Стан.** Земельный участок для строительства и организации деятельности гостиничного комплекса будет передан в аренду сроком **на 30 лет. Ограничения прав в использовании** земельного участка: водоохранная зона р. Волма (1,1600 га), зона санитарной охраны водозабора Волма (1,1600 га), придорожная полоса (контролируемая зона) автомобильной дороги (1,1550 га), охранная зона линии связи и радиофикации (0,0340 га, 0,0168 га, 0,1028 га, 0,0888 га, 0,0728 га, 0,0440 га), охранная зона линии электропередачи (0,0100 га, 0,0076 га, 0,0150 га, 0,0054 га), охранная зона сетей и сооружений газоснабжения (0,0320 га).

**Не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение *(гостиничный комплекс)*,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером 623680604601000731 по адресу: Минский район, Боровлянский с/с, д. Королев Стан. В состав гостиничного комплекса входят трехэтажное здание с цокольным этажом общей площадью 2 948,1 кв. м и котельная.

**Начальная цена единого предмета аукциона – 1 401 074,76 бел. руб. *(один миллион четыреста одна тысяча семьдесят четыре белорусских рубля 76 копеек).***

**Задаток 10% от начальной цены – 140 107,48 бел. руб. *(сто сорок тысяч сто семь белорусских рублей 48 копеек)*.**

Расходы, связанные с формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении создания земельного участка, составляют **85,10 бел. руб. (восемьдесят пять белорусских рублей 10 копеек).**

**Продавец – Минский районный исполнительный комитет, контактный телефон (017) 204 35 25.**

**Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, выразивший согласие на приобретение единого предмета аукциона, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, **в течение 10 рабочих дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией договора аренды земельного участка и возникновения основанного на нем права **обязан:**

- внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
- возместить Минскому райисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;
- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.

После совершения названных действий и представления организатору аукциона и в Минский районный исполнительный комитет копий платежных документов, но **не позднее 2 рабочих дней**, между победителем (единственным участником) аукциона и Минским районным исполнительным комитетом **заключается договор купли-продажи не завершенного строительством незаконсервированного объекта**.

**В тот же срок** Минский районный исполнительный комитет передает победителю (единственному участнику) аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и выдает экземпляр протокола для **заключения договора аренды земельного участка с Боровлянским сельским исполнительным комитетом.**

Оплата по договору купли-продажи за **не завершенное строительством незаконсервированное капитальное строение** производится **в течение 30 дней** с момента заключения договора купли-продажи.

**Условия аукциона в отношении продажи не завершенного строительством незаконсервированного капитального строения:**

победитель (единственный участник) аукциона **в течение 2 месяцев** с момента заключения договора купли-продажи обязан обеспечить приведение в надлежащее состояние территории (ограждение, уборка мусора, окос травы и др.);

строительство осуществляется в соответствии с разработанной проектно-сметной документацией и в пределах установленных нормативных сроков строительства;

победитель (единственный участник) аукциона **в течение 30 дней** с момента заключения договора купли-продажи обязан заключить инвестиционный договор с Минским областным исполнительным комитетом.

Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.05.2016 № 370.

**Аукцион состоится 21.04.2017 г. в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5.**

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 320, 324, по 17.04.2017 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 17.00.**

**Контактные телефоны организатора аукциона: + 375 (17) 205-46-61, +375 (17) 207-71-34.**

**Задатки перечисляются не позднее 17.04.2017 г. на р/с №3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (задатки) не позднее 17.04.2017 г.**;

**представить в Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, в соответствии с которым победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение единого предмета аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%, обязан возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Адметна, што Эрдаган яшчэ ў пачатку свайго кіравання абвясціў курс на інтэграцыю ў ЕС. У 2005 годзе краіна пачала афіцыйны перагаворны працэс на гэтую тэму. Аднак паступова турэцкі лідар пачаў астываць да гэтай ідэі, як, зрэшты, і вялікая частка турэцкага грамадства. Да 2015 года колькасць жадаючых уступіць у ЕС скарацілася з 75 да 20%.

### НОВЫЯ СУПРАЦЬ СТАРЫХ

Паводле апытання, праведзенага Грамадскім даследчым цэнтрам Еўразіі ў перыяд з 3 па 9 сакавіка, 57,57% турэцкіх выбаршчыкаў не падтрымаюць змены ў Канстытуцыі, «за» прагаласуюць 42,43%. Зараз сітуацыя можа змяніцца. Папулярнасць Эрдагана сярод турэцкай дыяспары ў Еўропе расце. «Чым больш еўрапейскія лідары крытыкуюць Эрдагана, тым больш туркаў яго падтрымліваюць», — растлумачыў адзін з членаў турэцкай абшчыны ФРГ. Мільёны еўрапейскіх выбаршчыкаў — важны электаральны рэсурс для Эрдагана і крыніца збянтэжанасці для заходніх палітыкаў. На практыцы атрымліваецца так, што краіны ЕС ператвараюцца ў знешнюю пляцоўку — або, як трапна заўважыў адзін з экспертаў, задні двор — мусульманскай палітыкі.



Між тым Анкара дасягнула поспеху яшчэ і ў расколе самога Еўрасаюза. Супраць палітыкі старых членаў ЕС у дачыненні да Турцыі рэзка выступіла Венгрыя. Кіраўнік МЗС рэспублікі Петэр Сіярта здзекліва заўважыў, што краіны Заходняй Еўропы, не даючы турэцкім міністрам выступаць перад дыяспарай, дэманструюць «палітыку падвойных стандартаў». Еўрасаюзу, на думку венгерскіх улад, трэба ўмацоўваць сувязі з Анкарой, у поўнай меры выконваць свае абавязацельствы па пагадненні аб мігрантах і даць нарэшце станоўчы адказ на турэцкую заяўку аб прыёме ў ЕС. Венгрыю падтрымала Польшча: кіраўнік МЗС краіны Вітольд Вашчыкоўскі заявіў, што «галандцы зрабілі памылку, дзейнічаючы занадта жорстка». Міністр нагадаў, што разрыў адносін з Анкарой вельмі нявыгадны Брусселю: калі Турцыя зноў адкрые межы для бежанцаў, хваля мігрантаў захлісне Еўропу.

Раскол паміж старымі і новымі членамі ЕС па турэцкім пытанні вельмі заўважны яшчэ і таму, што Францыя, пры Аландзе настроеная досыць пратурэцкі, гэтым разам адмаўчалася. Хоць французскі МЗС дазволіў Чавушаглу выступіць у горадзе Мец, ключавыя кандыдаты на пасаду прэзідэнта адрэагавалі на гэта досыць жорстка. Эмануэль Макрон абвінаваціў Анкару ў правакацыях і заклікаў падтрымаць саюзнікаў па Еўрасаюзе, даўшы туркам «узгоднены адказ ад імя ўсяго ЕС», а Франсуа Фіён і ўвогуле заявіў, што Францыя павінна па прыкладзе Нідэрландаў забараніць усе мітынгі ў падтрымку красавіцкага рэферэндуму.

### ЭКАНОМІКА І ПАЛІТЫКА

Цяпер у Турцыі знаходзіцца па меншай меры 3 мільёны бежанцаў з Сірыі, Афганістана, Ірака, Емена і іншых краін. Усе яны мелі намер трапіць у Еўропу па так званым «балканскім шляху». Пакуль Турцыя з'яўляецца адносна надзейным шлюзам на шляху мігрантаў. Але калі дагавор з ЕС будзе дэнансаваны, мільёны бежанцаў могуць распачаць новую спробу пранікнуць у Еўропу. Гаворка ідзе аб пагадненні, якога Турцыя і ЕС дасягнулі ў 2016 годзе. Згодна з ім нелегальныя мігранты з Блізкага Усходу, якія прыбываюць у ЕС праз тэрыторыю Турцыі, але не атрымліваюць прытулку, высылаюцца ў Турцыю. Пры гэтым за кожнага высланага нелегала ЕС будзе прымаць аднаго бежанца, ужо зарэгістраванага ў Турцыі.

Пагадненне таксама прадугледжвае вылучэнне Еўрасаюзам сродкаў на ўтрыманне бежанцаў у памеры да €6 млрд. Аднак пакуль было пералічана толькі $677 млн. Часткай здзелкі з боку ЕС таксама было абяцанне ўвядзення бязвізавага рэжыму для Турцыі ў абмен на выкананне 72 умоў, з якіх пакуль выканана толькі палова. Эксперт Дэвід Філіпс у інтэрв'ю часопісу Foreign Policy выказаў меркаванне, што «здзелка была мёртванароджаная», паколькі ЕС і не збіраўся даваць краіне магчымасць бязвізавага ўезду. Большасць еўрапейцаў не хоча бачыць Турцыю ў шэрагах аб'яднання. Паводле даных сацыялагічнага апытання, дзве трэці немцаў выступаюць за тое, каб урад Германіі ініцыяваў спыненне перагавораў з Турцыяй наконт яе ўступлення ў Еўрасаюз. Дзеля гэтага жыхары ФРГ гатовы прыняць рызыкі, звязаныя з разрывам міграцыйнага пагаднення. У сваю чаргу, турэцкі ўрад змог «прадаць» пагадненне сваім грамадзянам, толькі паабяцаўшы ім бязвізавы ўезд у ЕС, паколькі ўнутры краіны шмат тых, хто незадаволены знаходжаннем у краіне мігрантаў. Турцыя сцвярджае, што выдаткавала на іх утрыманне больш за €7 млрд.

Што да цяперашняй канфрантацыі, то з гэтай нагоды нямецкая газета Suddeutsche Zeitung пісала, што пры дыягностыцы сітуацыі неабходна дакладна расставіць акцэнты адносна таго, хто і як ставіць задачы і дамагаецца іх рашэння ў Еўропе і ў Турцыі праз эскалацыю адносін. На думку выдання, адносіны «ў хуткай будучыні будуць нармалізаваныя». Варта згадаць асобныя красамоўныя лічбы. Згодна са статыстыкай, на долю ЕС у Турцыі прыпадае амаль 65% тавараабароту. Стары Свет таксама не мае намеру губляць для сябе гэтую краіну. Турцыя — пяты найбуйнейшы гандлёвы партнёр ЕС пры аб'ёме аперацый у памеры €140 млрд. «Якімі б непрымальнымі ні былі некаторыя рэчы, не ў нашых знешнепалітычных і геапалітычных інтарэсах разрываць адносіны з Турцыяй», — заявіла раней канцлер Германіі Ангела Меркель. З іншага боку, пакуль немагчыма дакладна сказаць, што на гэта адкажа Анкара.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Рэйтынг Трампа ўпаў да рэкордна нізкага ўзроўню

Рэйтынг прэзідэнта ЗША Дональда Трампа ўпаў да самага нізкага значэння з моманту яго інаўгурацыі. Аб гэтым паведамляецца ў штодзённым апытанні кампаніі Gallup. Дзейнасць амерыканскага лідара падтрымліваюць 37% апытаных, а не падтрымліваюць 58%. 22 студзеня, калі быў праведзены першы падобны збор даных, колькасць амерыканцаў, якія станоўча і адмоўна адгукнуліся пра працу Трампа, была роўнай — па 45%. Тэндэнцыя нізкага рэйтынгу захоўвалася на працягу першых месяцаў яго прэзідэнцтва.

### Марцін Шульц афіцыйна стаў кандыдатам у канцлеры Германіі

Дэлегаты пазачарговага з'езда Сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі, які праходзіў у Берліне, прагаласавалі за абранне экс-кіраўніка Еўрапарламента Марціна Шульца на пасаду старшыні сваёй палітычнай сілы. Ён змяніў на гэтым месцы Зігмара Габрыэля і афіцыйна становіцца кандыдатам у канцлеры і галоўным супернікам Ангелы Меркель у перадвыбарнай гонцы. Сацыял-дэмакраты абвясцілі аб сваім рашэнні вылучыць Шульца лідарам партыйнага спісу яшчэ ў студзені. Вырашана, што былы кіраўнік Еўрапарламента мае больш шанцаў у ходзе перадвыбарнай барацьбы схіліць электарат на бок «чырвоных», чым Габрыэль.

### У сусветным рэйтынгу шчасця з'явіўся новы лідар

Нарвегія абышла шматгадовага лідара, Данію, у сусветным рэйтынгу шчасця. Ён быў апублікаваны 20 сакавіка, у Сусветны дзень шчасця, у рамках глабальнай ініцыятывы ААН Sustainable Development Solutions Network (SDSN). Як адзначаецца, за год нарвежцам удалося падняцца з чацвёртага на першае месца. Далей з мінімальным адрывам размеркаваліся Данія, Ісландыя і Швейцарыя. Эксперты падкрэслілі, што чатыры краіны настолькі блізкія па паказчыках, што змяняюць на вяршыні рэйтынгу адна адну з году ў год.

### Да 2048 года ў морах і акіянах можа скончыцца ўся рыба



У Сусветным акіяне да 2048 года рыба можа знікнуць у выпадку, калі падыходы да кіравання рыбалоўствам не зменяцца. Аб такой небяспецы папярэдзілі спецыялісты Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF) у Расіі. Эксперты зрабілі адпаведныя высновы на падставе даных Харчовай і сельскагаспадарчай арганізацыі ААН (FAO), якія сцвярджаюць, што 90% марскіх рыбалоўных промыслаў ужо асвоена. Пры гэтым на мяжы знішчэння ўжо знаходзіцца белая рыба, якая з'яўляецца асноўнай марской крыніцай харчавання для чалавецтва. 90% папуляцый буйных драпежных рыб, як адзначаюць эксперты, ужо ніколі не змогуць аднавіцца да ранейшай колькасці, у тым ліку тунец, траска, палтус, меч-рыба.

■ Шок

# Бізнес на чалавечых жыццях



## Карэспандэнт «Звязды» — аб падрабязнасцях справы «чорных рыэлтараў» з залы суда

**Гэта рэзанансная гісторыя, звязаная з продажам кватэр у Магілёве і забойствам іх уладароў, узрушыла грамадскасць яшчэ два гады таму. У нечалавечым спосабе здабывання грошай абвінавачваюцца маладыя муж і жонка і два іх саўдзельнікі. Дзеянні арганізаванай злачыннай групы былі спынены пры спробе здзейсніць чарговае, сёмае, забойства. Матэрыялаў з жахлівымі падрабязнасцямі сабрана аж на 71 том. Летась справа пачала разглядацца ў Магілёўскім абласным судзе. Слуханні ідуць кожны будны дзень, пачынаючы з лістапада. На дзвярах у залу пасяджэнняў — аркуш з пералікам артыкулаў, па якіх абвінавачваюцца падсудныя. Інфармацыя ледзь умяшчаецца на старонцы фармату А4. Па справе праходзіць больш за 360 сведак — міліцыянеры, натарыусы, рэгістратары з агенцтва нерухомасці, камунальнікі, суседзі ахвяр і нават тыя, каму пашчасціла пазбегнуць страшнай долі, — усе, хто так ці інакш стаў відавочцам цёмных здзелак.**

### Па слядах крывавых спраў

Крыху нагадаем пра ўдзельнікаў гучнай справы і некаторыя яе абставіны. Усе абвінавачаныя — маладыя людзі ва ўзросце ад 31 да 36 гадоў. Ніводны з іх не меў адукацыі, дазваляючай займацца рыэлтарскімі паслугамі. Адзіны, хто меў прафесію, Сямён Бяражны. І тое кранаўшчыка. Арганізатарамі злачынстваў абвінавачанне лічыць мужа і жонку Ігара і Таццяну Гершанковых, ужо неаднаразова судзімых, у тым ліку за махлярства. Забойства пры абцяжарваючых абставінах, выкраданне чалавека, махлярства, вымаганне, разбой, знішчэнне дакументаў, незаконны аборт псіхатропных сродкаў — гэта яшчэ няпоўны спіс тых злачынстваў, у якіх яны падазраюцца. Крывавы бізнес не перашкаджаў маладым людзям займацца выхаваннем дваіх непаўналетніх дзяцей. На лаве падсудных таксама два саўдзельнікі Гершанковых — Барыс Калеснікаў, у якога ўжо ёсць крымінальны вопыт, і Сямён Бяражны, які дагэтуль не меў судзімасці.

Устаноўлена, што першае забойства, звязанае з продажам кватэры, Ігар Гершанкоў здзейсніў у 2009 годзе разам з Барысам Калеснікавым. Ахвярай стаў немалады чалавек, які вёў асацыяльны лад жыцця і меў вялікую запазычанасць па камунальных плацяжах. Ён лёгка даверыўся «дабрадзеям», якія паабяцалі прадаць яго кватэру і знайсці больш танны варыянт нават з даплатай. Але пасля продажу кватэры былога гаспадара пасадзілі ў машыну і вывезлі ў невядомым напрамку. Як потым высветлілася, да загадзя падрыхтаванай магілы. А на наступны дзень тое ж самае зрабілі з яго сужыцелькай...

На паток справа была пастаўлена ў 2013 годзе. Магчыма, натхніла беспакаранасць за зробленае 4 гады таму. Падыходзячы варыянт, як сведчыць следства, выбіраўся са спіса даўжнікоў за камуналку, які меўся на руках у Ігара Гершанкова. Вывучалася біяграфія кандыдата, улічваліся яго ўзрост, наяўнасць сваякоў і сацыяльны статус. Асацыялы траплялі ў поле зроку ў першую чаргу, бо з гэтай катэгорыі лягчэй дамовіцца і меншая верагоднасць таго, што іх пачнуць шукаць, калі яны раптоўна знікнуць. Замест Барыса Калеснікава ў «бізнес» уключаецца Сямён Бяражны, які да знаёмства з Ігарам Гершанковым паспеў папрацаваць на кране. На адпрацоўку адной кватэры ў зламыснікаў сыходзіла часам да некалькіх месяцаў. Некаторыя даводзілася прыватызаваць. Для сваіх чорных здзелак кампаньёны выкарыстоўвалі здымнае жыллё, якое дэманстравалі чарговаму кліенту як варыянт для абмену. Адна з такіх кватэр знаходзілася ў доме па Пушкінскім праспекце. Гаспадыня і не здагадвалася, якія гульні вядуцца ў яе за спінай. Яна здавала кватэру па гадзінах і сутках і не заўсёды сустракалася з тымі, хто ёй карыстаўся. Магла пакінуць ключ у бліжэйшым кіёску, а часовыя кватаранты, калі сыходзілі, клалі яго на стол і проста зачынялі дзверы.

Пакуль вырашаліся пытанні па продажы кватэры, саўдзельнікі апякалі яе ўладальніка, куплялі яму ежу і спіртное, але як толькі яму ў рукі траплялі грошы, чалавек адразу ж ішоў у расход. Зноўшчыкі нават эканомілі на пахаванні сваёй ахвяры. Толькі для першай купілі самую танную труну, астатніх проста закопвалі ў зямлю з цэлафанавым пакетам на галаве. А каб у ахвяры не ўзнікла ніякіх падазрэнняў, арганізоўвалі пікнік на прыродзе і шчодра паілі «сябра» гарэлкай з клафелінам. Як толькі чалавек засынаў, закопвалі ў зямлю, не клапоцячыся пра тое, жывы ён ці не.

### Ахвяру збіраліся задушыць чырвонай вяроўкай

— Устаньце, суд ідзе, — суддзя абвяшчае пачатак пасяджэння і пачынаецца чарговае апытанне сведак.

З моманту затрымання і па сённяшні дзень удзельнікі крымінальнага квартэта знаходзяцца ў адзіночных камерах і сустракаюцца толькі ў судзе. Нягледзячы на вочныя стаўкі, эксгумаваныя трупы, паказанні сведак, усе, акрамя Сямёна Бяражнога, прытрымліваюцца адмаўляцца ад таго, што мелі нейкае дачыненне да забойстваў.

Ігар Гершанкоў наогул паводзіць сябе ўпэўнена: маўляў, апынуўся на лаве падсудных выпадкова, і ніякай віны за ім няма. Сямён Бяражны адзіны, хто цікавіцца тым, хто прысутнічае ў зале, і я хутка адчуваю на сабе яго погляд. Барыс Калеснікаў, наадварот, старанна хаваецца ад людскіх вачэй у далёкім куце клеткі. Таццяна таксама закрываецца капюшонам і скідвае яго толькі тады, калі гэтага патрабуе суддзя. Побач з ёй на лаве ляжыць тоўстая папка з паперамі. Абвінавачаным дазваляецца рабіць копіі матэрыялаў справы і весці запісы. Асабліва гэтым карыстаецца Ігар, які ахвотна (з дазволу суддзі) задае пытанні сведкам і нешта памячае ў сваім блакноце. Да амапаўцаў, якія прысутнічалі пры яго затрыманні, у яго наогул іх было шмат. Ён нават ледзь не заблытаў аднаго з іх, спрабуючы пачуць выгадны для сябе адказ. 26 сакавіка 2015 года, як сведчаць матэрыялы справы, Сямён Бяражны і Ігар Гершанкоў везлі чарговую ахвяру на могілкі і яшчэ не ведалі, што за імі ўжо сочаць. А калі зразумелі, паспяшаліся адарвацца ад пагоні. Сысці ад пераследу ім перашкодзіў план «Перахоп». Уцекачы паспрабавалі схавацца ў гаражным масіве, але трапілі ў тупік. Сямён Бяражны, які быў за рулём, здаўся без супраціўлення, кажуць відавочцы, а вось Ігара Гершанкова прыйшлося літаральна выцягваць з задняга сядзення. «Ён увесь час круціўся, як вуж, і хацеў выслізнуць», — удакладніў супрацоўнік АМАПа. Мужчына, якога збіраліся забіць, сядзеў на пярэднім сядзенні, сціскаючы ў руках пакет з грашыма. Ён быў у шоку. У матэрыялах следства ёсць інфармацыя, што гэтага чалавека збіраліся задушыць з дапамогай чырвонай вяроўкі. Амапавец пацвердзіў, што бачыў, як Гершанкоў падчас пагоні рабіў спробы схаваць рэчавы доказ.

### Яма на вясковых могілках

Апошняя здзелка абяцала прынесці сужэнцам Гершанковым і Сямёну Бяражному больш за 37 тысяч долараў. Размова ідзе пра кватэру, дзе жылі два браты. На той момант небяспека навісла над адным з іх. «Пасля смерці бацькоў гэта жыллё ператварылася ў прахадны двор, дзе час бавілі за распіццём спіртных напояў», — паведаміла суду адна з жыхарак гэтага дома. У той момант, калі ў братоў была рэальная пагроза пазбавіцца кватэры за камунальныя даўгі, паявіліся «дабрадзеі». Яны падрыхтавалі глебу і знайшлі пакупнікоў праз інтэрнэт. Кватэра была не ў найлепшым стане, але цана сямейнай пары спадабалася. Гаспадар папярэдзіў, што ўсімі справамі будзе займацца яго стрыечны брат Андрэй. Пад выглядам яго дзейнічаў адзін з цяперашніх падсудных. Пакупнікам адразу ж паставілі ўмову: грошы павінны быць у доларах і ў поўным аб'ёме. Маўляў, на гэты дзень намячалася яшчэ адна здзелка. У натарыяльнай канторы сямейная пара перадала грошы гаспадару кватэры, а на наступны дзень ім патэлефанавалі са Следчага камітэта і паведамілі, што гэта была за здзелка. Жанчына расказала суду, што навіна была для яе з мужам шокавай. І яны потым добраахвотна дапамаглі братам падшукаць падыходзячы варыянт з кватэрай. Дарэчы, цяпер яны амаль суседзі. Аднапакаёўка, дзе жывуць браты, знаходзіцца якраз цераз дом ад іх. Чалавек, якому кватэра ледзь не каштавала жыцця, прайшоў курс лячэння, і ў яго ёсць усе шанцы змяніць лёс.

Усяго на рахунку чорных рыэлтараў шэсць загубленых жыццяў. Тром магілёўчанам, з улікам апошняга, пашчасціла пазбегнуць страшнай долі. Хоць магілы іх ужо чакалі.

Жыхарка вёскі Сумарокава расказала суду, як аднойчы пайшла наведаць магілу мужа і ўбачыла непадалёк яму. Ёй стала цікава, хто ж памёр. Бо, калі б гэта быў нехта з вёскі, яна б дакладна ведала. Дзеля цікаўнасці яна амаль тыдзень хадзіла, каб прасачыць, каго там збіраюцца пахаваць. А калі не дачакалася, паведаміла ў сельсавет, і гэтую ямку проста засыпалі.

Следства між тым працягваецца. «Не выключана, што ўсплывуць яшчэ нейкія новыя падрабязнасці гэтай справы, — кажа **дзяржаўны абвінаваўца, старшы пракурор аддзела пракуратуры Магілёўскай вобласці Аляксандр РАМАНАЎ.** — Але тых злачынстваў, у якіх абвінавачваюцца гэтыя людзі, хопіць, каб панесці вельмі сур'ёзнае пакаранне. Жанчыне пагражае да 25 гадоў пазбаўлення волі, усім астатнім — працяглы тэрмін адбывання пакарання або выключная мера».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
*zigulya@zviazda.by*

***P.S.** «Звязда» і далей будзе знаёміць чытачоў з падрабязнасцямі гэтай рэзананснай справы*

■

■ Будзь пільным!

# Махляры не грэбуюць нічым

## у спробах завалодаць чужымі грашыма і маёмасцю

**Якімі ж даверлівымі бываюць нашы людзі, калі самі аддаюць у рукі махлярам значныя сумы грошай! А калі ўжо становіцца канчаткова ясна, што даўжнік і не збіраецца вяртаць, ідуць у міліцыю. Трэба аддаць належнае і майстрам аферы: яны нярэдка выступаюць здольнымі псіхолагамі і сапраўднымі артыстамі, калі раскручваюць перад наіўнымі патэнцыяльнымі ахвярамі свае гісторыі, а сюжэты складаюць літаральна на ходу. Потым усё гэта абарочваецца стратамі і слязамі для пацярпелых людзей, часта — крымінальнымі справамі для махляроў.**

Колькасць крымінальных спраў па артыкуле «Махлярства» апошнім часам істотна расце ў Брэсцкай вобласці. Паводле інфармацыі **старшага памочніка пракурора рэгіёна Ліліі СМАЛЯРУК**, за 2016 год заведзена 530 такіх спраў, тым часам як у папярэднім годзе іх было 384. І ўжо за студзень гэтага года колькасць махлярскіх спраў вырасла на 80 працэнтаў у параўнанні з леташнім паказчыкам. Махляры яўна робяць поспехі ў асяроддзі даверлівых грамадзян.

...38-гадовая жыхарка Брэсцкага раёна расказвала ўсім знаёмым пра свой паспяховы бізнес. Але ж на яго развіццё патрабаваліся сродкі, якія жанчына абяцала вярнуць з прыбыткам. Прадпрымальная махлярка здолела падмануць 38 чалавек. Ёй перадалі суму, эквівалентную 630 тысячам долараў!

Яшчэ адна «бізнес-лэдзі», брастаўчанка 25 гадоў, таксама апавядала пра свае ўдалыя праекты. Паводле яе легенды, камерцыйная дзейнасць вельмі хутка прыносіць вялікія дывідэнды, трэба толькі своечасова ўкладваць сродкі ў развіццё і станавіцца сузаснавальнікамі. Дзевяць чалавек паддаліся на ўгаворы і ўклалі сродкі, а таксама маёмасць на суму 240 тысяч дэнамінаваных рублёў. На выручаныя грошы махлярка гуляла ў казіно. Цяпер гэтым прадпрымальным падманшчыцам пагражае да 10 гадоў пазбаўлення волі.

Такія майстры афер, вядома, дзейнічаюць найбольш у вялікіх гарадах. З усіх махлярстваў, зафіксаваных у вобласці, 45 працэнтаў былі здзейснены ў Брэсце. Яно і зразумела. Тут лягчэй знайсці даверлівых кліентаў. Скажам, даў чалавек аб'яву ў газеце аб паслугах па перацяжцы мэблі. І цэны ў яго як быццам крыху ніжэйшыя за іншых майстроў. Знайшліся ахвотныя. Ён прыехаў, мэблю забраў, узяў грошы за работу, і на тым «прадпрыемства» скончылася... Другі абяцаў пастаўляць новыя дзверы і браў грошы наперад. Гэта некаторыя са шматлікіх прыкладаў падобных махлярстваў па Брэсце.

Але і асобныя дзеячы раённага маштабу часам не адстаюць ва ўменні зарабіць на залішняй даверлівасці. Шматдзетная маці са Століна знаёмілася з мужчынамі па інтэрнэце. Паводле легенды, яна была адзінокай прывабнай дзяўчынай (фота прыгажуні знайшлося ў сеціве), якая чакае станоўчага, надзейнага сябра з сур'ёзнымі намерамі. І такіх на Беларусі знайшлося аж шасцёра. Мужчыны прапаноўвалі руку і сэрца пасля пэўнага перыяду стасункаў анлайн. Прыгажуня згаджалася... але ў яе раптам узнікалі матэрыяльныя цяжкасці, напрыклад, у выглядзе першага ўзносу на будучую кватэру. І закаханыя слалі грошы ў Столін. Выніковая сума перавысіла 24 тысячы рублёў.

А што наша «нявеста»? Наўрад ці яна думала, што ашуквае жывых людзей, яна бачыла перад сабой патэнцыйных кліентаў для «дойкі» і дзейнічала далей. Суд уплічыў наяўнасць малых дзяцей і тое, што яна мае інваліднасць, што часткова кампенсавала ўрон. Ёй прызначылі пакаранне, не звязанае з пазбаўленнем волі. Ці зробіць маладая жанчына адпаведныя высновы на будучыню, ці навучыць сваіх дзяцей, што падманваць людзей брыдка і ганебна, ніхто не ведае.

Часцей за ўсё такія людзі замест сумлення маюць толькі імкненне да наживы і азарт, падобны на паляўнічы. Яны любяць «працаваць» у асяроддзі пенсіянераў, бо пажылых людзей лягчэй падманваць. На дапамогу ім усё часцей прыходзяць камп'ютарныя тэхналогіі. Летась было зафіксавана некалькі выпадкаў, калі спекулянты здымалі пенсіі з банкаўскіх картак.

**Начальнік упраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі Брэсцкага абласнога УУС Генадзь ВАЙТОВІЧ** расказаў пра выпадкі камп'ютарных афер, якія здзейснілі непаўналетнія «хакеры». Столінскі юнак так прызвычаіўся залазіць на асабістыя старонкі грамадзян у розных сацыяльных сетках, што за кароткі тэрмін украў грашовыя сродкі больш чым у 80 чалавек. Вядома, раённым аддзелам СК была заведзена крымінальная справа. А драгічынскія аператыўнікі і следчыя за галаву ўзяліся, калі ўбачылі доказы камп'ютарных махінацый 10-гадовага хлопчыка. Ён змог перагнаць сабе грошы з дабрачыннага рахунка, адкрытага ў Брэсце на лячэнне 3-гадовага хлопчыка. Дзіця мае анкалагічнае захворванне. На лячэнне за мяжой збіралі, што называецца, усёй грамадой. Але ў нейкі момант частка грошай з рахунка знікла. Спецыялісты змаглі прасачыць рух фінансавага патоку і такім чынам выйшлі на малалетняга жыхара Драгічына. А ён, аказваецца, украдзеныя сродкі пусціў на развіццё свайго акаўнта ў сеткавай гульні «Танкі Анлайн». У апошнім выпадку ўзрост парушальніка закона ўсё ж дазваляе спадзявацца, што яго несумненныя разумовыя здольнасці можна яшчэ накіраваць у станоўчае рэчышча.

А вось з дарослымі інтэрнэт-ферыстамі, як і з тымі, хто працуе ў жывым кантакце з патэнцыйнымі ахвярамі, размовы часта заканчваюцца ў зале судовых пасяджэнняў. Ды лепей усё ж ахвярай не станавіцца. І быць надзвычай уважлівымі, калі справа датычыцца ўласных грошай. Колькі нашых суграмадзян пацярпела праз сваю дабрыню, калі згаджаліся дапамагчы іншым у справе атрымання крэдыту! Сотнямі лічыў кожны банк парučыцеляў, якія выплачвалі чужыя пазыкі. Пра гэта шмат гаварылі і пісалі, і цяпер ахвотных паручыцца за чужую сумленнасць і плацежаздольнасць стала нашмат менш. Але, як паказвае практыка, у тым ліку крымінальных спраў, людзі зноў наступаюць на тыя ж граблі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■



# «Мы настроены перамагаць»

## Уладзіслаў КУЛЕШ расказвае пра зборную, барацьбу «армейцаў» з БГК і свае перспектывы

**Мужчынская нацыянальная зборная па гандболе правяла першы пасля чэмпіянату свету збор і на выхадных згуляла два таварыскія паядынкі з камандай Швейцарыі. У першым матчы мацнейшымі былі швейцарцы, а вось у другім нашым гульцам удалося вырваць нічыю на апошніх секундах сустрэчы. Зараз асноўная задача дружыны Юрыя Шаўцова — добра падрыхтавацца да адборачных матчаў чэмпіянату Еўропы — 2018. Нагадаем, там нашай зборнай яшчэ трэба будзе згуляць два матчы з палякамі і па адным з сербамі і румынамі.**

Акрамя таго, блізка кульмінацыя чэмпіянату краіны, дзе галоўнымі прэтэндэнтамі на званне чэмпіёнаў, ужо па традыцыі, з'яўляюцца брэсцкі БГК імя Мяшкова і мінскі СКА. Падчас збораў галоўнай каманды краіны і напярэдадні першай сустрэчы лідараў чэмпіянату мы пагутарылі з гульцом нацыянальнай зборнай і левым паўсярэднім «армейцаў» Уладзіславам Кулешам.

***— Улад, вось ужо каторы раз Юрый Шаўцоў выклікае на збор нацкаманды адну моладзь, ці ёсць сэнс весці падрыхтоўку без касцяка зборнай?***

— Думаю, ёсць, бо ў нас поўным ходам ідзе амаладжэнне. У трэніровачны лагер і на таварыскія гульні ў Швейцарыю адправілісе практычна ўсе «армейцы», але гэта і не дзіўна — сёння ў СКА сабрана ўся самая лепшая моладзь. Наша задача паказаць Юрыю Анатолевічу, чаго мы дамагліся за гэты час, каб у трэнера была нагода прыцягнуць кагосьці з гульцоў у зборную краіны на будучыя матчы. Мэта гэтага збору была адна — падрыхтавацца да адборачных гульняў Еўра-2018, на ім мы адшліфавалі ўсе старыя напрацоўкі.

***— Восенню ў стартавым матчы адбору да Еўра беларусы прайгралі зборнай Румыніі і паставілі сябе ў складаную сітуацыю...***

— Румыны тады эмацыянальна былі мацнейшыя, а мы дзесьці недаацанілі саперніка, плюс не ўсё атрымлівалася ва ўласнай гульні. Але з сербамі выправілі памылкі, рэабілітаваліся і самі перад сабой, і перад нашымі балельшчыкамі.

Зараз, у маі — два паядынкі з палякамі, у іх, можна сказаць, новая каманда, вельмі шмат маладых хлопцаў, прыкладна нашага ўзросту. Але ў зборнай добры патэнцыял, і на чэмпіянаце свету яны гэта паказалі, прайграўшы чэмпіёнам — зборнай Францыі — усяго адзін мяч. Вядома, магчыма, што ў зборную Польшчы вернуцца некалькі былых гульцоў, тады змагацца з імі нам будзе цяжэй. Тым больш што на старце адборачнага турніру палякі ўжо страцілі 4 ачкі і ў матчах з намі паспрабуюць іх вярнуць, адступаць ужо няма куды, зборнай Польшчы трэба выйграваць усе матчы, каб выходзіць на Еўра. Але і мы настроены перамагаць і павінны гэта зрабіць.

***— За плячыма ў цябе ўжо чэмпіянат Еўропы і свету, адчуваеш сябе ў зборнай краіны ўпэўнена?***

— Яшчэ не зусім. Хлопцы падтрымліваюць, але пакуль не магу трапіць у патрэбную каляіну, неабходна над гэтым працаваць. Ужо, вядома, няма такога хвалявання, як было раней, але і ўпэўненасць у поўнай меры яшчэ не прыйшла.

***— Чэмпіянат краіны выходзіць на фінішную прамую і ўжо заўтра СКА сустрэнецца з БГК.***

— У першую чаргу хочацца навязаць брастаўчанам добрую барацьбу, паказаць, што мы таксама не «хлопчыкі для біцця». У нас нармальная, добрая каманда, будзем настройвацца і спрабаваць перамагчы. Безумоўна, у нашых сустрэчах з БГК фаварытамі будуць «мяшкоўцы», бо яны гуляюць у Лізе чэмпіёнаў і выступаюць там дастаткова добра, але ў нас таксама ёсць шанц на поспех.

***— Яшчэ СКА выйшаў у «фінал чатырох» Балтыйскай лігі. Якія задачы перад вамі стаяць у гэтым турніры?***

— Быць першымі, іншае месца нас не задаволіць. Шанцаў там, вядома, больш, чым у чэмпіянаце краіны. У паўфінале будзем гуляць з фінскім «Рыіхімякі Кокс», якому прайгралі ў мінулым годзе ў фінале (у дадатковы час) Балтыйскай лігі.

На жаль, не змаглі прынясць «фінал чатырох» ва Уручча, у палацы ў гэты час будуць праходзіць нейкія спаборніцтвы. Так, вядома ж, хацелася згуляць дома, тут родныя сцены, свае балельшчыкі — гэта іншая атмасфера, ды і далёкая дарога адымае шмат сіл.

***— Андрэй Крайноў у нядаўнім інтэрв'ю казаў пра тое, што СКА зноў будзе спрабаваць трапіць у СЕХА-лігу.***

— Нам патрэбны гэты турнір, «варыцца» ў чэмпіянаце краіны, шчыра кажучы, дастаткова слабым, надакучыла. СЕХА-ліга — усё ж іншы ўзровень, гэта быў бы плюс і для зборнай, і для маладых гульцоў. А вось казаць пра прычыны, чаму туды не бяруць СКА, не ў маёй кампетэнцыі.

***— Пераход Арцёма Каралька і Вячаслава Салдаценкі моцна паслабіў каманду?***

— Вядома, хлопцы былі лідарамі, і яны зараз нам бы вельмі спатрэбіліся. Але прайшоў час, і мы ўжо прывыклі разлічваць на сябе, на той склад, які ёсць сёння.

***— На твой погляд, хто з іх у лепшай сітуацыі: Каралёк у чэмпіянаце Францыі, дзе яго клуб сярод лідараў, або Салдаценка ў Бундэслізе, але яго каманда на грані вылету.***

— Я думаю, у іх прыкладна роўнае становішча. У Бундэслізе аўтсайдар можа абыграць лідара, у Францыі ўсё больш-менш спакойна і прадказальна. Самае галоўнае, што і Арцём, і Слава не сядзяць на лаўках, а маюць добры гульнявы час, яны малайцы.

***— Кіраўнікі СКА не хаваюць, што ёсць попыт і на іншых маладых гульцоў, і тут на розум перш за ўсё прыходзіць тваё прозвішча...***

— Так, былі прапановы і мне, разглядалі іх, але пакуль безвынікова. У мяне кантракт са СКА да 2018 года. Можа быць, я яшчэ патрэбен камандзе на наступны год *(смяецца)*. Вядома, хацелася б паспрабаваць сябе ў больш моцнай лізе, каб працягваць расці ў прафесійным плане. Бо цяпер мы гуляем мала добрых матчаў, а ў Францыі і Германіі кожны тыдзень па дзве наймацнейшыя гульні, з напалам, дзе ўсё вырашаецца на апошніх 5 хвілінах.

***— На ваша пакаленне ўскладаюць сур'ёзныя надзеі, у тым ліку траплянне на Алімпійскія гульні.***

— Не ведаю, ці ўдасца нам туды прабіцца, але федэрацыяй, кіраўнікамі нашага клуба, трэнерамі ўсё робіцца для таго, каб мы змаглі згуляць на Алімпіядзе. Вадзім Леанідавіч Сашурын, Юрый Анатолевіч Шаўцоў пастаянна праводзяць зборы, семінары спецыяльна для работы з моладдзю, таму засталося толькі нам самім старанна працаваць.

■ Вакол арэн

# НА БЕРАЗЕ ДНЯПРА



## Адзін з самых буйных спартыўных аб'ектаў Гомельшчыны прыняў чарговы міжнародны турнір

**Жлобін ужо даўно стаў паспраўднаму спартыўным горадам, сваю рэпутацыю ён пацвердзіў напярэдадні, прыняўшы гандбольны адборачны турнір да чэмпіянату Еўропы — 2017 сярод дзяўчат. Месцам правядзення стаў Цэнтр алімпійскага рэзерву, які разгарнуўся на самым беразе Дняпра.**

Госці з Партугаліі, Швейцарыі і Грузіі па заслугах ацанілі спартыўны комплекс і засталіся задаволеныя прыёмам беларусаў.

*— Мы заўсёды гатовыя прымаць гасцей, таму што рэспубліканскія і міжнародныя турніры праводзім даволі часта,* — адзначае **дырэктар ЦАР Аляксей СКУРКОЎСКІ.** — *І атрымліваем толькі станоўчыя водгукі, таму што гатовы аказваць і беларускім, і замежным спартсменам поўны пералік паслуг, пачынаючы ад пражывання, харчавання і заканчваючы аднаўленчымі медыцынскімі працэдурамі.*

> «Падобныя спартыўныя цэнтры проста аддушына, прыходзім сюды і адчуваем сябе жыхарамі сучаснага, развітога горада».

У мінулым годзе Цэнтр алімпійскага рэзерву ў Жлобіне адзначыў сваё дзесяцігоддзе. Сёння ён складаецца з сямі аб'ектаў і ўяўляе сабой своеасаблівую піраміду. Першымі (у 2006 годзе) адкрыліся лядовая арэна, разлічаная на 2000 гледачоў, і плавальны 50-метровы басейн. Пазней з'явіўся аквапарк, які адразу стаў адным з любімых месцаў гараджан. Ён, дарэчы, быў прызнаны «Найлепшым турыстычным аб'ектам» Рэспубліканскага конкурсу «Пазнай Беларусь».

У дадатак у крокавай даступнасці ад ужо наяўных аб'ектаў былі пабудаваны палац гульнявых відаў спорту на 1500 глядацкіх месцаў, вяслярная база і лыжаролерная траса. Каб Цэнтр быў паўнавартасным універсальным аб'ектам, неўзабаве з'явіўся і гасцінічны комплекс «Дняпроўская жамчужына», які можа прыняць 114 чалавек.

*— Сёння ў нас займаецца каля тысячы дзяцей па 7 аддзяленнях. Усе віды спорту — алімпійскія, таму карыстаюцца папулярнасцю, і, трэба сказаць, ускладаем надзеі на нашых навучэнцаў. Самымі паспяховымі відамі пакуль з'яўляюцца хакей і плаванне, добрыя вынікі ў нашых выхаванцаў і ў акадэмічным веславанні, у веславанні на байдарках і каноэ і ў валейболе. Біятлон і гандбол пакуль для Жлобіна з'яўляюцца маладымі відамі, таму пра вынікі казаць рана,* — адзначае Аляксей Скуркоўскі.



Падчас спаборніцтваў трыбуны не пустуюць.

**Да тэмы:**

**Зборная Беларусі (U-19) у адборачным турніры да чэмпіянату Еўропы заняла трэцяе месца ў групе і не прайшла на Еўра-2017.**

Тое, што комплекс жыве актыўным жыццём, бачыш, ледзь наблізіўшыся да спартыўных аб'ектаў: практычна каля кожнага з іх клубіцца дзятва.

*— Мы тут амаль кожны дзень. Старэйшы сын займаецца хакеем, малодшы — пакуль плаваннем,* — расказвае **жыхарка Жлобіна Святлана МІКУЛІЧ.** — *Для такіх гарадоў, як наш, падобныя спартыўныя цэнтры проста аддушына, прыходзім сюды і адчуваем сябе жыхарамі сучаснага, развітога горада. Пакуль чакаю дзяцей з трэніровак, магу ў кавярню зайсці, перакусіць пасля работы, а некаторыя бацькі ў нас за гэтыя паўтары-дзве гадзіны паспяваюць пазаймацца ў трэнажорнай зале або схадзіць на фітнес. У выхадныя мы тут наогул усёй сям'ёй: муж — у лазню, мы з дзецьмі — на горкі ў аквапарк. Пару разоў на месяц можам дазволіць гэта сабе без шкоды для сямейнага бюджэту. Шчыра вам скажу, кошты ў нас значна адрозніваюцца ад мінскіх, таму спачатку вельмі часта прыязджалі са сталіцы і Гомеля ў наш аквапарк. Калі такія комплексы будуюцца прадумана, з розумам, не ўзнікае пытання — «навошта?» Іншая справа, калі б яны не былі запатрабаваныя,* — адзначае Святлана.

Насельніцтва Жлобіна — 75 тысяч чалавек, і спорт тут любяць, гэта відаць па наведвальнасці матчаў хакейнага клуба «Металург» (кіраўніцтва арэны падкрэслівае, што па статыстыцы гульні каманды наведвае кожны другі жыхар горада), ды і гандбольная кваліфікацыя, якая прайшла напярэдадні, пацвярджае актыўнасць грамадзян. Кіраўніцтва комплексу адзначае, што асноўная доля фінансавання на ўтрыманне аб'екта вылучаецца з бюджэту, але вось-вось лічбы наблізяцца да адзнакі 50 на 50.

*— Мы блізкія да таго, каб пакрываць палову выдаткаў на ўтрыманне ЦАР за кошт гаспадарчай дзейнасці. У асноўным гэта даходы ад аквапарку, спа-салона, салярыя, більярда, кавярні. Значную частку сродкаў мы атрымліваем ад здачы плошчаў у арэнду, правядзення карпаратыўных мерапрыемстваў і, вядома ж, вучэбна-трэніровачных збораў беларускіх і замежных спартыўных клубаў. Больш за ўсё, вядома, да нас едуць расіяне, таму што кошт у нас ніжэйшы, а якасць паслуг вышэйшая. Але былі і больш далёкія госці, у 2015 годзе прыязджалі плыўцы з Бахрэйна і таксама засталіся задаволеныя,* — расказвае Аляксей Леанідавіч.

Поўным прызнаннем паспяховага функцыянавання Цэнтра стала ўключэнне яго ў экскурсійны тур «Залатое кальцо Гомельшчыны».

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*
■

# «Да бярозы белай прыхінуся»

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2.** Ядавітае рэчыва, вывядзенню яго з арганізма садзейнічае ўжыванне бярозавага соку. **6.** Службовая асоба пры дыпламатычным прадстаўніцтве. **8.** Памяшканне для мыцця, дзе бярозавы венік даражэйшы за грошы. **9.** Тое, што трымаецца ў сакрэце; лічылася, што толькі дзецям раскрывае бяроза свае ... . **12.** Тое, што і праява. **13.** Бярозавая ... . Дугападобны пралёт паміж дзвюма апорамі, увіты бярозавымі галінкамі; на Берасцейшчыне пад ёй праязджаў вясельны картэж. **14.** Пярэдні бок манеты. **15.** «І пад гром птушыных галасоў//Да бярозы белай прыхінуся —//Буду прагна піць салодкі ...». З верша П. Панчанкі «Вясною». **16.** Грыб, які расце на бярозе. **17.** Вялікая птушка. **18.** Унутраная маральная сіла. **20.** Бясколерны газ з непрыемным пахам. **22.** Калі лопаюцца пупышкі на бярозе — час сеяць ... (прыкм.). **24.** Месца касьбы. **25.** «Белыя бярозы//Спалі на ўзлеску,//Як сваю галоўку//Узняла ...». З верша В. Вярбы «Пралеска». **26.** «У вяснушках ...//Сок бярозавы п'е». З верша Я. Пушчы «Вясна». **27.** «І соку кропелькі, як ...,//Як град, пасыпаліся з бярозы». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Дзядзька-кухар»). **28.** Перавязаны канец веніка, снапа.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1.** Свойская жывёліна, якой на рогі надзявалі бярозавы вянок, каб перасцярагчы яе ад ваўкоў. **3.** Расліна з белымі ягадамі, якая паразітуе на бярозе. **4.** Старажытнаегіпецкая багіня жыцця і здароўя. **5.** Верхні слой бярозавай кары; на Беларусі — самы першы пісьмовы матэрыял. **7.** Вулкан на востраве Сіцылія. **8.** Прадмет хатняга абсталявання. **10.** «Наша мова — ... вясні,//Аксаміт жаўруковае песні». З верша Я. Золака «Наша мова». **11.** «За пралескай вельмі хутка//Засінела ...». З верша К. Цвіркі «Вясна». **17.** Публічнае выступленне. **19.** «Пад птушыны нясмелы ...//Ручаінка з гары паўзе.//Сакавік — вясны маладзік —//Праразаецца пакрысе». З верша А. Грачанікава «Капяжы...». **21.** Снапы, складзеныя конусам. **22.** Пахвала, адабрэнне. **23.** ... прыляцеў, вясна будзе (прык.). **24.** Металічная прылада для прасавання.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,** *г. Дзяржынск.*



**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** 2. Таксін. 6. Аташэ. 8. Лазня. 9. Таямніца. 12. Выява. 13. Арка. 14. Аверс. 15. Сок. 16. Чага. 17. Птах. 18. Дух. 20. Аміяк. 22. Хлеб. 24. Пакос. 25. Пралеска. 26. Васна. 27. Слёзы. 28. Камель. **Па вертыкалі:** 1. Карова. 3. Амяла. 4. Ісіда. 5. Бяроста. 7. Этна. 8. Лава. 10. Бярозавік. 11. Незабудка. 17. Прамова. 19. Ускрык. 21. Капа. 22. Хвала. 23. Бусел. 24. Прас.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.10 | 19.25 | 12.15 |
| Віцебск — | 6.59 | 19.15 | 12.16 |
| Магілёў — | 7.00 | 19.15 | 12.15 |
| Гомель — | 6.56 | 19.11 | 12.15 |
| Гродна — | 7.25 | 19.40 | 12.15 |
| Брэст — | 7.26 | 19.41 | 12.15 |

### Месяц

*Апошняя квадра 20 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

### Імяніны

***Пр.** Апанаса, Арсенія, Лазара.*
***К.** Бенядзікта, Любаміра, Мікалая.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## Будзь пільным

### НЕЗНАЁМЕЦ ПРАСІЎ ГРОШАЙ

**У Мінску былі зафіксаваныя выпадкі завалодання грашамі ашуканскім шляхам чалавекам, які тэлефанаваў мінчанам, прадстаўляючыся супрацоўнікам ДАІ або следчым.**

Ён паведамляў, што ў іх сваякоў узніклі праблемы, для спрыяльнага вырашэння якіх неабходна няму перадаць пэўную суму грошай, паведаміў аддзел інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама. У адным з выпадкаў званок паступіў дзіцяці 8 гадоў. Чалавек назваўся супрацоўнікам міліцыі, сказаў, што бацька дзіцяці збіў мужчыну, якому цяпер на лячэнне патрэбныя грошы. Пасля гэтага званка каля акна дома, дзе пражывае дзіця, стаяў хлопец і чакаў, пакуль той скіне яму грошы. Аднак дадому своечасова вярнулася маці, таму грошай зламыснік не дачакаўся і ўцёк.

Для наступнай сваёй «ахвяры», таксама пажылой жанчыны, зламыснік прыдумаў, што яе ўнука збіла машына. І вырашэнне пытання каштуе тысячу рублёў. За грашыма прыехалі прама дадому. Яшчэ адзін падобны факт адбыўся з жанчынай, якая пражывае па праспекце Незалежнасці. Ёй патэлефанаваў нібыта следчы з Санкт-Пецярбурга, які паведаміў пра некаторыя праблемы ва ўнука. Каб дапамагчы яму, бабуля перадала зламысніку 10 тысяч долараў. Цяпер зламысніка вышуквае міліцыя.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Даты Падзеі Людзі

### 21 САКАВІКА

*Сусветны дзень паэзіі. Заснаваны па рашэнні 30-й сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА ў лістападзе 1999 года*

**1840** год — нарадзіўся Францішак Багушэвіч, беларускі паэт, празаік, публіцыст, перакладчык. У гісторыю Беларусі ўвайшоў як актыўны ўдзельнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 года і як адзін са стваральнікаў беларускай літаратурнай мовы. Працаваў судовым выканаўцам. З 1884 года жыў і працаваў у Вільні, быў адвакатам судовай палаты, вёў у асноўным справы сялян і гарадской беднаты. З 1898 года жыў у Кушлянах на Смаргоншчыне. Выдаў два паэтычныя зборнікі «Дудка беларуская» (пад псеўданімам Мацей Бурачок) і «Смык беларускі» (пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава), у якіх паказаў селяніна, каторага абдзялілі пры адмене прыгоннага права, абдзірае казна, крыўдзіць суд і царскія чыноўнікі. Сацыяльныя пытанні вострa ставіцца таксама ў вершах Багушэвіча «Бог не роўна дзеле», «Ахвяра» і інш. У творчасці паэта гучаць і матывы нацыянальнага адраджэння.



**1917** год — на ўстаноўчым сходзе прадстаўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў горада быў створаны Віцебскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Налічваў каля 300 дэпутатаў, з'яўляўся найбуйнейшым пасля Мінскага Саветам у Беларусі. Першым дакументам Савета быў прыняты 21 сакавіка 1917 года зварот «Да ўсіх працоўных горада», у якім галоўнай задачай вызначалася барацьба з усялякімі спробамі наступлення контррэвалюцыі. Савет заклікаў рабочых да яднання, да барацьбы за свабоду, дэмакратычную рэспубліку, лічыў неабходным стварэнне спецыяльнай рабочай міліцыі.

**1947** год — нарадзіўся (в. Вялікая Кракотка Слонімскага раёна) Анатоль Паўлавіч Ліхацэвіч, беларускі вучоны ў галіне сельскагаспадарчай меліярацыі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член-карэспандэнт Акадэміі аграрных навук (1996—2002), замежны член Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук. Аўтар больш як 250 навуковых прац у галіне рэгулявання воднага рэжыму сельскагаспадарчых культур. Прапанаваў для ўмоў Беларусі экалагічна бяспечную рэсурсазберагальную тэхналогію дажджавання сельскагаспадарчых культур.

**1952** год — нарадзіўся (г. Барысаў) Мікалай Мікалаевіч Касцюковіч, беларускі фізік-тэарэтык. Адзін з заснавальнікаў (у 1990—1996 гадах — вучоны сакратар) Беларускага фізічнага таварыства. Член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі арганізацыйных і кіраўнічых навук (2000). Аўтар навуковых прац па агульнай тэорыі адноснасці, праблемах арганізацыі навуковай дзейнасці, гісторыі навукі.

### Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, публіцыст:**
*«Усе шляхі прыводзяць*
*не да Рыма,*
*А да родных вербаў і бяроз».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Радыё, перадача «Па вашых заяўках».**

**— Добры дзень! Вучні 7 «Б» класа школы нумар 21 горада N просяць для сваёй настаўніцы паставіць гук бормашыны!**

Пасля таго як села за руль, акрамя ўпрыгажэнняў і касметыкі, пачала радавацца такім падарункам, як летняя гума, поўны бак бензіну, новыя дворнікі, каністра «незамярзайкі»...

**— Учора з жонкай у прас гулялі.**

**— Гэта як?**

**— Я на яе пляваў, а яна шыпела...**

Гляджу на сябе ў люстэрка — за што майму мужу такое шчасце.

...Потым устаю на вагу — ды яшчэ і столькі!

**Навіны свету моды.**

**Расійскія куцюр'е распрацавалі для маламаёмнай часткі насельніцтва спецыяльныя пінжакі з пахам хлеба і агурка на рукаве для занюхвання гарэлкі.**




Малюнак Пятра КОЗІЧА.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1101.

Нумар падпісаны ў 19.30 20 сакавіка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12